незалежная газета

№ 12 (658) 24 сакавіка 2010 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## Ці будзе ў 2010 годзе даражэць жыллё

Старонка 5



## Як хакеіст хакеісту

Старонка 10



## Вялікія княгіні і ворагі ВКЛ у адным томе

Старонка 12



«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Губернатар знік

Пэўных звестак пра лёс Уладзіміра Саўчанкі няма ад 11 сакавіка.

26 студзеня прэс-служба Адміністрацыі прэзідэнта паведаміла, што кіраўнік Гродзенскай вобласці, Уладзімір Саўчанка, папрасіў вызваліць яго ад займанай пасады. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама матываваў гэта станам здароўя і прасіў пераводу «на іншую працу, з меншым аб'ёмам задач». Аляксандр Лукашэнка задаволіў яго просьбу і падпісаў адпаведны ўказ.

Навіна аб адстаўцы выклікала шмат чутак. Афіцыйнай версіі пра хваробы Саўчанкі ніхто ў Гродне не паверыў. Былы губернатар часцяком хадзіў на працу пешкі і гараджане пастаянна бачылі яго на вуліцах. Ніякіх звестак аб хваробе раней не было.

**Працяг на старонцы 8.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



## 25 Сакавіка
# Дзень Волі

свята нацыянальнага вызвалення. Старонка 2.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Хто ў банк нясе, а мы Шульману

Быў бізнэс — стала шоу. Нібы серыял, другі месяц цягнецца працэс беларускага шоу-бізнэсмэна №1. На ім прысутнічала **Наста Шамрэй**.

Пацярпелыя расказваюць пра махлярствы Генадзя Шульмана, кіраўніка прадзюсарскай кампаніі «Клас-Клуб ДК». Абвінавачаны бароніцца: кажа, што ў бізнэсе яго справы дрэнь, каціць бочкі на ўказ прэзідэнта 2006 года... Паказанні пацярпелых і абвінавачанага кардынальна розняцца. Гэта яшчэ больш заблытвае і так нялёгкую крымінальную справу.

Адзін з пацярпелых — даўні сябар абвінавачанага. Дырэктар прыватнай фірмы Леанід Шпілько вучыўся з Генадзем Шульманам на адным курсе Інстытута культуры. Сябравалі сем'ямі, ездзілі разам на шашлыкі.

**Працяг на старонцы 9.**

# У дзень смерці Кастуся Тарасава ў яго нарадзіўся ўнук

Памёр культавы пісьменнік 1990-х. Яго цела знайшлі ў здыманай ім кватэры ў панядзелак.

«Апошні свой ліст Кастусь Тарасаў адправіў электроннай поштай 19 сакавіка. У нядзелю мне пазваніла яго сястра, турбавалася, што Кастусь не адказвае на тэлефон, — расказвае мэнэджэр Таварыства беларускай мовы Сяргей Кручкоў, блізка знаёмы з пісьменнікам. — 22 сакавіка я пайшоў на кватэру, якую здымаў Кастусь Тарасаў, — ён не адмыкае. Падумалі самае страшнае — так і выйшла. Ён быў ужо нежывы».

Для пакалення сённяшніх 30-гадовых Тарасаў быў культавым пісьменнікам. Яго гістарычныя аповесці «Пагоня на Грунвальд», «Памяць пра легенды» адкрывалі савецкім дзецям велічны свет сярэднявечнай гісторыі Беларусі.



SVABODA.ORG

За часамі Лукашэнкі Тарасаў працаваў у незалежных газетах — «Свабода», «Навіны», «Новы час». У 2006 годзе пісьменнік перанёс інсульт. Апошнія гады Кастусь Тарасаў жыў адзін на здыманай кватэры. Прапіску меў «Рэспубліка Беларусь».

«Мы яшчэ смяяліся, што ў кагосьці кватэра, а ў Кастуся цэлая рэспубліка», — працягвае Сяргей Кручкоў.

**Працяг на старонцы 11.**

# Дзень Волі дазволілі

Мінгарвыканкам дазволіў апазіцыйным арганізацыям правесці 25 Сакавіка ў Мінску акцыю з нагоды Дня Волі.

У заяўцы прасілі дазволіць збор а 18-й гадзіне на пляцоўцы ля Акадэміі навук, а потым ходнікамі па праспекце прайсці да сквера Янкі Купалы, дзе павінен быў адбыцца мітынг з удзелам кандыдатаў у дэпутаты ў мясцовыя саветы.

Гарадскія ўлады, па традыцыі, адправілі апазіцыю на Бангалор. Тым не менш, месца збору дазволілі запланаванае.

Лідэр БНФ Аляксей Янукевіч падкрэслівае, што ў святкаванні Дня Волі возьмуць удзел усе дэмакратычныя сілы.

Па словах Янукевіча, акцыя 25 Сакавіка павінна стаць прыгожай і ўрачыстай. «Гэта выдатнае беларускае свята, якое трэба адзначаць», — кажа Янукевіч.

На пытанне, як збіраюцца дзейнічаць арганізатары, калі АМАП перагародзіць дарогу ў цэнтр, Янукевіч адказаў: «Гэта будзе залежыць ад той колькасці людзей, якая прыйдзе. Скажу дакладна адно, што на Бангалор людзей ніхто не павядзе».

**Зміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Што вы будзеце рабіць на 25 сакавіка?

25 Сакавіка — дзень абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі — адзначаецца як свята нацыянальнага вызвалення. «НН» звярнулася да вядомых людзей з пытаннем, як яны святкуюць гэты дзень.

**Мікалай Чаргінец, палітык-лукашэнкавец:**
Я лічу, што мы павінны адчуваць Дзень Волі кожны дзень, а не толькі ў нейкі адзін канкрэтны. Таму і святкаваць неяк асабліва не варта. Увогуле, не трэба палітызаваць і манапалізаваць ідэі свабоды і дэмакратыі. Я падтрымліваю развіццё дэмакратыі ў Беларусі. Да саміх падзей 25 Сакавіка 1918 года ў мяне падвойнае стаўленне. З аднаго боку, тыя людзі прагнулі стварыць незалежную беларускую дзяржаву. І гэта варта вітаць. А з іншага, сёння дату 25 Сакавіка выкарыстоўваюць у палітычных мэтах.
На гісторыю трэба глядзець, нічога з яе не выкідваючы. Калі ў часы СССР нешта выкідвалі з падручнікаў, гэта трэба вярнуць. Трэба, каб усё ў гісторыі народа і краіны заставалася — і чорнае, і белае.

**Лявон Вольскі, спявак:**
Пакуль няма канкрэтных планаў. Але нешта прыдумаем крэатыўнае. Увогуле я лічу, што нам трэба набліжацца да фармату Дня св.Патрыка. Трэба ісці ў масы, пазбаўляць гэтае свята палітызаванасці.

**Аляксандр Фядута, паліттэхнолаг:**
25 Сакавіка я буду ў Варшаве на сустрэчы з Адамам Міхнікам, галоўным рэдактарам «Газеты Выборчай», а таксама вялікім сябрам Беларусі. Сядзем дзе–небудзь узняць келіх пад тост «Жыве Беларусь».

**Сяргей Дубавец, журналіст:**
Думаю, павінна быць пераемнасць. Гэта свята чыстай ідэі, якая сама па сабе не старэе, не замутняецца і не відазмяняецца. Звычайна чыстую ідэю дэфармуюць людзі, якія ад прыроды сваёй неідэальныя. Калі яны датыкаюцца да ідэі, каб «на свой розум» вырабіць з яе нешта, часта атрымліваецца прафанацыя. Калі ж яны датыкаюцца да ідэальнага, каб самім наблізіцца да чысціні, ідэя можа саслужыць ім добрую службу.
А самы просты спосаб тут — каб прысутнічала пераемнасць. Мне пашанцавала сёлета быць запрошаным да чалавека, які 25 Сакавіка адзначаў яшчэ ў ГУЛАГу, таемна, разам з Ларысай Геніюш.
Па вялікім рахунку, яны там і апынуліся за сваю вернасць ідэалу. Мы будзем шмат размаўляць, згадваць людзей паваеннага супраціву, спяваць пад фартэпіяна, пераглядаць фоткі. І непрыкметна нас усіх агорне атмасфера чыстай ідэі, ідэальнага свята.

**Павел Севярынец, лідэр Хрысціянскай дэмакратыі:**
25 Сакавіка я буду на плошчы перад Акадэміяй навук. Вазьму ўдзел ва ўрачыстым шэсці. Дзень Волі — гэта Дзень Незалежнасці нашай краіны. Пакуль Беларусь несвабодная, трэба адзначаць гэтае свята на вуліцах.

**Радзім Гарэцкі, акадэмік-геолаг:**
Я заўсёды буду адзначаць Дзень Волі і сваёй душы, і сэрца — гэта галоўнае. Сёлета мы плануем прыватна адзначаць Дзень Волі, вузкім колам сяброў. Сярод іх будзе і ўнучка Якуба Коласа — Марыя Міцкевіч. Раней заўсёды хадзілі на шэсці. Але з узростам звычкі змяняюцца. Цяпер ужо не той узрост, каб хадзіць некуды. Галоўнае, каб свята ў сэрцы было.

**Іван Шыла, лідэр салігорскай моладзі:**
Я буду ў Мінску 25–га, вазьму ўдзел у вулічным шэсці. А потым з сябрамі прыватна будзем адзначаць. Увогуле лічу, што ў будучым гэтае свята павінна адзначацца спакойна, без афіцыёзу, на асабістым узроўні. Як, напрыклад, у Чэхіі, дзе нацыянальныя святы адзначаюцца вывешваннем сцягоў і сяброўскімі сустрэчамі.

**Гутарыў АП**

## СЦІСЛА

### На Вербніцу — перавод стрэлак

Беларусь пераходзіць на летні час 28 сакавіка. Перавод стрэлак на гадзіну наперад адбудзецца а 2-й ночы. Варта падрыхтавацца: пару дзён будзе падавацца, што спіш на гадзіну меней.

### Рада Еўропы асудзіла смяротныя прысуды ў Беларусі

Пра гэта гаворыцца ў заяве старшыні Камітэта міністраў РЕ Мішлін Кальмі-Рэй, генеральнага сакратара РЕ Турб'ёрна Ягланда і кіраўніка Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы Меўлюта Чавушаглу. У канцы мінулага тыдня ў Беларусі былі расстраляныя 25-гадовы Андрэй Жук і 30-гадовы Васіль Юзапчук. Першы прызнаны вінаватым у забойстве інкасатараў СПК «Бальшавік-Агра». Другога пакаралі за забойствы пажылых жанчын у Брэсцкай вобласці.

### У Мінску паставяць помнік Караткевічу

Гэта прадугледжвае план Міністэрства культуры па святкаванні 80-годдзя з дня нараджэння пісьменніка. Помнік мае паўстаць да 2011 года.

### У Пінску сальманэла ў дзіцячым садку

У бальніцы з атручваннем трапілі 86 выхаванцаў і тры работніцы садка №29. Ва ўсіх іх выявілі сальманэлу.

### 25 сакавіка — сонца і цяпло

Паводле Гідраметэацэнтра, 25-га пераважна без ападкаў. Тэмпература ноччу мінус 5 — плюс 2°С, днём плюс 6—13°С, па паўднёвым захадзе да плюс 15°С. А 26 сакавіка па поўдні краіны чакаецца да плюс 18°С.

**СМ**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 6000 рублёў. З 1 красавіка яна вырасце да 7500 рублёў у сувязі з ростам рознічнай цаны.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ
ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014
Асабовы рахунак:
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)
Від аплаты | Дата | Сума
За газету "Наша Ніва"
Агулам
Касір

КВІТАНЦЫЯ
ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014
Асабовы рахунак:
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)
Від аплаты | Дата | Сума
За газету "Наша Ніва"
Агулам
Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,** дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз рэдакцыю

**Алесю Н.** са Слуцкага раёна.
**Соф'і Я., Міхаілу З., Іраідзе З., Л.Л., Вользе П., В.Я.П., В.М.П., Д.К., Юрыю Л., Леаніду Г., А.Р., Рыце Н., Наталлі М., А.А., Генадзю К., А.К., Н.Б., С., А.С., В.Ц.** з Мінска.
**Уладзіміру Л.** з Маладзечна.
**Валянціне А., Святаславу Г.** з Талачынскага раёна.
**Уладзіміру Я., Юліі І.** з Барысава.
**Антону Т.** з Жодзіна.
**А.А.** з Полацка.
**Сяргею Т.** з Лідскага раёна.
**Андрэю К.** з Глыбоцкага раёна.
**Адзе Р.** з Шаркаўшчынскага раёна.
**Андрэю Б.** са Шчучына.
**Мікалаю Ш.** з Салігорска.

# АГП адмаўляецца ад удзелу ў мясцовых выбарах

**Такое палітычнае рашэнне прыняў XIII з'езд Аб'яднанай грамадзянскай партыі 21 сакавіка.**

З'езд, на які прыехала 112 дэлегатаў з усіх абласцей краіны, прайшоў у Палацы культуры МТЗ. Да прыкладу, два гады назад удзельнікам падобнага мерапрыемства даводзілася змяшчацца ў цесным, але гасцінным памяшканні Сядзібы БНФ.

Хаця цалкам для з'езда памяшканне так і не выдзелілі. У нядзелю ў палацы праходзіў «Мядовы кірмаш». А ўсе палітычныя жарсці адбываліся недзе ў глыбіні будынку, за яткамі з мёдам і «праваслаўнымі травамі».

На сцэне вісеў вялізны плакат, дзе былі фатаграфіі 33 сяброў партыі. Што адразу кінулася ў вочы, дык гэтая малая колькасць жанчын на гэтым фота. Лозунгам жа з'езда быў: «Ствараем новае, захоўваем лепшае».

На мінулым з'ездзе АГП шмат гаварылася аб хібах, крытыкавалі кіраўніцтва, цяпер жа асноўнай тэмай выступаў былі мясцовыя выбары. Кіраўніцтва партыі выступала за сыход АГП з выбарчай гонкі. Рэгіянальныя актывісты ўпіраліся — ім карціць прайсці кампанію да канца.

Старшыня АГП Анатоль Лябедзька гаварыў пра тое, што амаль усе сябры партыі не былі ўключаныя ў выбарчыя камісіі. Працягваюцца тыя ж парушэнні выбарчага заканадаўства, што былі і раней.

«Па такіх самых правілах будуць праходзіць і прэзідэнцкія выбары, — зазначыў А.Лябедзька. — А потым у нас запытаюцца, чаму мы згадзіліся ўдзельнічаць у мясцовых».

Намеснік старшыні Леў Марголін таксама за зняцце. «Людзі пабачаць, што хоць нехта не пайшоў на павадку ва ўлады», — зазначыў ён. Падтрымаў адмову ад удзелу і Васіль Палякоў з Гомеля.

Тым не менш, брэсцкая, мінская і гродзенская абласныя арганізацыі, а таксама мінская гарадская выступілі за ўдзел. Падтрымаў іх і яшчэ адзін намеснік Лябедзькі — Яраслаў Раманчук.

Лідэр «Маладых дэмакратаў» Міхась Пашкевіч зазначыў, што большасць сяброў АГП пайшлі на выбары не шляхам збораў подпісаў, а партыйным вылучэннем. Калі ж зараз адбудзецца зняцце з гонкі, то «партыя застанецца без выбараў увогуле».

Аляксандр Ваўчанін з Жодзіна цвёрда сказаў, што пойдзе да канца, бо не можа падмануць сваіх выбарцаў, але гэта апошнія ягоныя выбары. Уладзімір Зврнік з Чысці ідзе па безальтэрнатыўнай акрузе. Ён таксама не хоча сыходзіць.

Урэшце было прынятае палітычнае рашэнне не ўдзельнічаць у мясцовых выбарах, тым не менш, зрабіць выключэнне для «гарачых галоваў», якія прагнуць змагання.

Міжнародны сакратар Андрэй Дзмітрыеў гаварыў пра тое, што АГП мусіць быць бліжэйшай да Партыі БНФ. «У БНФ ёсць праграма нацыянальнага адраджэння, культуры, у нас ёсць эканоміка. У будучыні мы можам выйсці на новую кансерватыўную партыю», — зазначыў ён.

Дарэчы, беларускай мовы на з'ездзе было мала. Ёй карысталіся толькі вядучыя Аляксандр Дабравольскі і Зінаіда Бандарэнка, а таксама Анатоль Лябедзька з Міхаілам Пашкевічам. Іншыя прамаўлялі па-расійску.

Яраслаў Раманчук у сваім выступе адзначыў, што многія міжнародныя арганізацыі проста «скурвіліся». У прыватнасці, ён узгадваў МВФ, Сусветны банк, які даюць крэдыты беларускім уладам.

Лябедзька ганіў Рух «За Свабоду» і Мілінкевіча. У прыватнасці, ён гаварыў пра тое, што былы кандыдат у прэзідэнты паўсюль у Еўропе выступае за легімітызацыю ўлады Лукашэнкі.

З'езд прыняў рашэнне прызнаць дзейнасць кіруючых органаў за мінулыя два гады здавальняючай.

Калі прыйшла чарга вылучэння на старшыню, то аказалася, што альтэрнатывы ў Анатоля Лябедзькі няма. Барысаўскі прадпрымальнік Віктар Гарбачоў узяў самаадвод. «Мне не хапае сілаў, сродкаў і духу, каб узначаліць партыю», — зазначыў ён.

У выніку за Лябедзьку прагаласавала 89 чалавек са 109, што складае 81,6%. Супраць — 17 чалавек (15,6%). Гэта ўжо шосты тэрмін для Лябедзькі на чале партыі.

«Не ўсё было проста. Можна шмат гаварыць, хто каму рабіў якія прапановы. Некаторым калегам па дэмакратычным лагеры можна не падаваць руку», — зазначыў зноў абраны старшыня.

Ягонымі намеснікамі зноў абраныя Яраслаў Раманчук і Леў Марголін.

Цікава, што на з'ездзе амаль зусім не гаварылася пра прэзідэнцкія выбары. «Няма рэсурсу», — як прыватна адзначыў адзін з дэлегатаў.

**Зміцер Панкавец**




## Анатоль Лябедзька: Ідэя праймерыз правалілася

**Пасля скакнчэння працы з'езда на пытанні «Нашай Нівы» адказаў старшыня АГП Анатоль Лябедзька.**

**«НН»: Як Вам рашэнне наконт удзелу ў мясцовых выбарах? На першы погляд, яно палавінчатае. З аднаго боку партыя здымаецца з выбараў, але асобныя сябры арганізацыі могуць працягваць кампанію.**

**АЛ:** Нічога двухсэнсоўнага ў гэтым рашэнні няма. АГП як палітычная арганізацыя выходзіць з выбараў. Партыя абвясціла дэмарш мясцовым выбарам. Гэта рэакцыя на тыя працэсы, што адбываюцца ў краіне напярэдадні іх правядзення. Гэтым самым мы змагаемся за змяненне правядзення прэзідэнцкай кампаніі. Сябры АГП могуць паўдзельнічаць у выбарах як прыватныя асобы. Лічу гэта абсалютна нармальным.

**«НН»: Тое, што Вас абіралі на безальтэрнатыўнай аснове, не засмуціла?**

**АЛ:** Гэта толькі на паверхні, што на безальтэрнатыўнай. Апошнія два месяцы ўнутры партыі вялася пэўная праца. Гэта былі мярзотныя дзеянні, якія больш характэрныя трасцтаўнікам улады, а не апазіцыі. Але сюды былі замяшаныя нашы партыйцы і сябры іншых арганізацый. Я быў бы толькі рады, каб была створаная альтэрнатыўная каманда, якая б вяла сумленнае змаганне. Дзеянні ж пэўных асоб сумленнымі я не назаву. Цяпер мы маем добрую каманду, якая можа вылучаць старшыню партыі (неабавязкова Лябедзьку), кандыдата ў прэзідэнты (неабавязкова Лябедзьку). На сёння я нават не старшыня партыі, а антыкрызісны менеджэр.

**«НН»: Ужо па абранні Вы сказалі, што цяпер маеце права не падаваць руку некаторым апазіцыянерам. Дык каму?**

**АЛ:** Сачыце, каму не падам руку. Гэта і будзе адказ на вашае пытанне.

**«НН»: Чаму так мала гаварылі пра выбары прэзідэнцкія?**

**АЛ:** Можна сказаць, што мы не зусім падрыхтаваныя. Нельга гаварыць пра нейкую падрыхтоўку, калі гэтым займаецца толькі адна палітычная структура. Намі была распрацаваная ідэя «праймерыз», але яна фактычна правалілася. Прайграў я, прайграла наша каманда. Мы маглі б сёння праспяваць пра ўдзел у выбарах, назваць свайго кандыдата. Але што далей? Гэта несур'ёзна, пакуль няма больш шырокай кааліцыі.

**Гутарыў ЗП**

## Мілінкевіч: Ці буду ўдзельнічаць у выбарах, абвяшчу ў маі

Лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч паведаміў, што пра сваё рашэнне ўдзельнічаць ці не ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах абвесціць бліжэйшым часам. «У маі месяцы», — удакладніў ён.

«Я не лічу, што пра такія намеры трэба заяўляць як мага раней. Хоць, зрэшты, новыя выбары пачынаюцца з таго моманту, як скончваюцца старыя», — сказаў палітык.

Раней пра сваё рашэнне ісці на выбары ўжо заявілі Алесь Міхалевіч і Андрэй Саннікаў.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Лукашэнка ў горадзе мары Астапа Бэндэра

Пасля Венесуэлы кіраўнік Беларусі працягнуў сваё турнэ па Паўднёвай Амерыцы. 22 сакавіка Лукашэнка сустрэўся з прэзідэнтам Бразіліі Луісам Інасіу Лула да Сілвам.

### Макей запатрабаваў палепшыць якасць навін на ТВ

Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей 19 сакавіка на рэспубліканскім семінары-нарадзе ідэалагічных работнікаў запатрабаваў палепшыць якасць навін і інфармацыйна-аналітычных праграм на тэлеканалах Беларусі.

**ЗП**

## БХД наперадзе

**25 сакавіка скончыцца рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты на выбары ў мясцовыя саветы.**

Апазіцыйныя партыі змаглі вылучыць амаль паўтысячы сваіх кандыдатаў. Лідэрам у гэтай намінацыі з'яўляецца Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя. Ад БХД дакументы на рэгістрацыю падалі 173 чалавекі. Прычым, яны былі пазбаўленыя магчымасці вылучацца ад партыі, усе збіралі подпісы.

Гэта ўвогуле другі паказнік сярод палітычных партый. Больш толькі ў праўладных камуністаў — 207 вылучэнцаў.

Сустаршыня БХД Павел Севярынец кажа, што пра далейшы сцэнар удзелу партыі ў выбарах будзе вырашана на Нацыянальнай радзе, якая пройдзе 28 сакавіка.

«Шэраг рэгіянальных дэлегацый (Бабруйск, Гомель, Слонім) выступаюць за поўны сыход партыі з дыстанцыі. Яны тлумачаць гэта рэпрэсіямі, а таксама нежаданнем праз выбары легітымізоўваць уладу Лукашэнкі. Ёсць тыя, што выступаюць за ўдзел да канца. Трэція прапаноўваюць зняцца, калі ўжо пачнецца датэрміновае галасаванне, а скарыстаць перыяд агітацыі», — кажа П.Севярынец.

У «Справядлівага свету» (былая апазіцыйная Партыя камуністаў) 126 вылучэнцаў.

Ад АГП дакументы на рэгістрацыю падалі 94 чалавекі. Аднак пасля нядзельнага рашэння з'езда гэтая колькасць зменшыцца.

Партыя БНФ вылучыла зусім невялікую колькасць — 32 чалавекі. Партыйнае кіраўніцтва на суботнім Сойме дало кандыдатам вольніцу — хочаце здымайцеся, хочаце – не.

Ад сацыял-дэмакратаў Ляўковіча вылучана 32 чалавекі, ад «зялёных» — 5.

**ЗП**



КАЛАЖ АЛЕСЯ КУДРЫЦКАГА

# Нафту перакінуць праз акіян

**Беларусь рыхтуецца ажыццявіць адзін з самых фантастычных праектаў у сваёй гісторыі.**

Калі Чавес і Лукашэнка заявілі пра пастаўку ў Беларусь 4,2 мільёна тон нафты за год, меркавалася, што зменіцца сам прынцып супрацы паміж краінамі. Беларусь і Венесуэла займаліся нафтай і раней, з канца 2007 года. Сумеснае прадпрыемства «Петралера БелаВенесалана» мела здабываць 1 мільён тон нафты штогод і прадаваць яе ў іншыя краіны. Выходзіла горш, чым намячалася. Але на атрыманыя грошы спраўна закуплялася расійская нафта.

Цяпер гаворка вядзецца пра фізічную дастаўку паліва на адлегласць у дзесяць тысяч кіламетраў. Як мінімум 80 тысяч барэляў у дзень. Сур'ёзнасці ідэі надае той факт, што падпісаны кантракт аб стварэнні спецыяльнага супольнага прадпрыемства па дастаўцы нафты. Яно запрацуе праз два месяцы. Беларусі будзе належыць 25% акцый у ім. Венесуэльцы падбадзёрваюць — першы танкер з нафтай ужо стаіць на прычале ў чаканні каманды.

### Беларускі каштарыс

Калі адкінуць у бок пытанне аб утапічнасці задумы — гэта і спрабуюць зрабіць беларускія чыноўнікі, — трэба падлічыць, ці будуць такія пастаўкі эканамічна выгаднымі.

Беларускім бокам разглядаюцца тры асноўныя варыянты дастаўкі нафты ў краіну. Называюцца наступныя парты: літоўскі Бутынге, польскі Гданьск і ўкраінская Адэса. Кожны з іх мае істотныя недахопы.

Агульная хіба — парты могуць прымаць танкеры максімум на 90 тысяч тон.

Венесуэльская нафта вельмі цяжкая, а Літва і Польшча імкнуцца працаваць з палівам лепшай якасці. Яны могуць сказаць рашучае «не». Тады прыйдзецца звярнуцца да адэскага варыянту. Тут свае праблемы. Трубаправод Адэса—Броды працуе ў рэверсным рэжыме, то бок у супрацьлеглы бок, да Адэсы, а не ад яе. Кантракты заключаныя як мінімум да канца 2011 года, таму «пераключыць» трубу не ўдасца.

Застаецца варыянт чыгункі. Перавоз адной цыстэрны па тэрыторыі Украіны — $2000, па Беларусі — $726. Адна цыстэрна змяшчае 60 тон нафты. Такім чынам, толькі пры дастаўцы нафты ад Адэсы транспартныя страты складаюць $45 за тону.

Калі дадаць кошт дарогі праз акіян, атрымліваюцца яшчэ большыя лічбы. А трэба ж яшчэ і нешта заплаціць за нафту.

### Нігерыйская альтэрнатыва ці венесуэльскі падарунак

Адно з вырашэнняў праблемы, якое падказваюць эксперты, — дамаўленасць з прамежкавай краінай, напрыклад, Нігерыяй. Тады венесуэльская нафта будзе пастаўляцца ў Афрыку, а нігерыйская, у сваю чаргу, адпраўляцца ў Беларусь, што ненашмат, але скароціць транспартныя выдаткі. Прыводзіцца прыклад: адлегласць між Саудаўскай Аравіяй і ЗША таксама немаленькая, але гэта не замінае краінам вазіць нафту ў гіганцкіх маштабах.

Гаворка можа весціся і аб бясплатных пастаўках нафты на першым этапе. Па такім прынцыпе будаваліся адносіны Венесуэлы з Нікарагуа і Кубай. Калі можна Фідэлю, то чаму нельга Лукашэнку? Для яго дамовіцца з сябрам Уга пра бясплатную нафту хаця б на год — цяжкая, але выканальная задача.

### Хрэн ці рэдзька?

Пры ўсёй смешнасці ідэі, венесуэльскі варыянт — спроба вырвацца з-пад крыла Расіі і зменшыць яе манапольную прысутнасць на беларускім паліўным рынку. Займець альтэрнатыўнага пастаўшчыка хаця б на трацінy ад патрэбнага аб'ёму нафты выглядае прываблівa. Вось толькі ці саладзейшы венесуэльскі хрэн за расійскую рэдзьку?

**Яўген Васількоў**

**Нафтавыя «сябры» і спонсары Беларусі**

**Іран** — кантракт аб штодзённай здабычы 50 тысяч барэляў штодзень падпісаны ў 2008 годзе. Пакуль што ідзе толькі доследная здабыча. Праект мусіць даць аддачу праз 1,5—2 гады.

**Венесуэла** — кантракт на пастаўку падпісаны тыдзень таму. Меркаваная штодзённая пастаўка нафты — 80 тысяч барэляў штодзень (4,2 мільёна тон да канца года). У планах віцэ-прэм'ера Сямашкі дасягнуць 10 мільёнаў тон праз пару гадоў.

**Расія** — ажыццяўляе бязмытныя пастаўкі нафты ў Беларусь у памеры 6,3 мільёна тон плюс яшчэ 15 мільёнаў тон з 100%-ай выплатай мытаў.

AD ABSURDUM

## Нафта і блакітныя камізэлькі

Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Вось пачытаеш пра беларускі трыумф у Венесуэле, і неяк неспакойна робіцца на сэрцы. Нафта — гэта, вядома, добра, але ці не варта было б спярша параіцца з метэаролагамі? Так і чую ўсхваляваную дыктарку з БТ: «А цяпер пра надвор'е: у сувязі з магутным цыклонам у сярэдняй частцы Атлантыкі чакаюцца часовыя чэргі на бензакалонках ды перабоі з ацяпленнем». Як ні круці, а чорнае венесуэльскае золата будуць дастаўляць усё-такі не самалётамі і не цэпелінамі, а па неспакойным моры. Канечне, перспектывы глабальнага пацяплення выглядаюць спакусліва: хто ведае, магчыма, неўзабаве танкеры з нафтай будуць швартавацца наўпрост у марскім порце ў Браславе ці Полацку... Але гэта — справа будучыні. Пакуль тое, нафту будуць везці морам да Адэсы, а адтуль гнаць у сінявокую чыгункай. 10 млн т нафты плануе здабываць у Венесуэле Беларусь у бліжэйшай будучыні. Калі ўлічыць, што стандартная чыгуначная цыстэрна змяшчае 125 тонаў чорнага золата, то на гадавую порцыю венесуэльскай нафты спатрэбіцца 80 тыс. такіх цыстэрнаў. Збяры іх разам — і чыгуначны састаў з нафтай расцягнецца на на 1520 кіламетраў. Ды Беларусь такім цягніком падпяражацца, як Дзед Талаш патранташам! Беларускія нафтавікі б'юцца над найбольш выгодным маршрутам паставак. Але ім варта глядзець на справу шырэй: часам арыгінальныя ідэі можна адшукаць у зусім іншых сферах. Вось, напрыклад, на апошні Дзень салідарнасці на Кастрычніцкай плошчы назіралася незвычайная карціна. Упершыню апазіцыйную акцыю пратэсту суправаджалі не толькі бамбізы ў цывільнай вопратцы з дротам у вушах, але і цалкам бяскрыўднага выгляду прэс-афіцэры ў блакітных камізэльках-флікерах. Яны не толькі ахвотна давалі каментары журналістам (на бяспечнай аддаленасці ад месца падзеяў), але і гралі ролю адмысловай «высялі бяспекі». Маўляў, калі журналісты на акцыях адыходзяць ад прэс-афіцэраў — то самі вінаватыя. Адзін з іх нават даў журналістам параду: «Інфармацыю неабавязкова атрымліваць там, дзе адбываюцца падзеі».

То бок інфармацыю можна атрымліваць там, дзе ніякіх падзеяў не адбываецца. Распрацоўшчыкам нафтавага праекта варта было б ухапіцца за гэтыя словы. Гэта ж пераварот у навуцы! Магчыма, досвед сталічных ахоўнікаў парадку падкажа, як здабываць нафту там, дзе яе няма? Тады і ў Венесуэлу не трэба будзе цягнуцца.

Бадай, супрацоўніцтва нафтавікоў ды міліцыі магло б быць больш шчыльным. Тады нас абавязкова будуць чакаць сапраўдныя дзівосы.

## «Беларусь больш падобная да Кітая, чым да Еўропы»

**Віцэ-прэзідэнт Сусветнага банка па рэгіёне Еўропы і Цэнтральнай Азіі Філіп Ле Уэру зрабіў Беларусі сумнеўны камплімент.**

Падчас сустрэчы з прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Сідорскім у Мінску віцэ-прэзідэнт СБ зазначыў, што ў Сусветным банку вельмі задаволены вынікамі супрацоўніцтва з Беларуссю ў апошнія 10 гадоў.

Віцэ-прэзідэнт СБ павіншаваў беларускі ўрад з эканамічнымі поспехамі, дасягнутымі за апошняе дзесяцігоддзе: «Вы змаглі забяспечыць такі эканамічны рост, які больш блізкі да кітайскага, чым да еўрапейскага. Вы таксама змаглі забяспечыць велізарнае скарачэнне ўзроўню беднасці ў краіне».

«Мы ўпэўненыя ў тым, што, калі не адбудзецца чарговых фінансавых крызісаў у краінах-партнёрах, мы зможам значна прыбавіць сёлета», — сказаў Сідорскі.

У снежні 2009 года Рада дырэктараў СБ прыняла рашэнне аб пашырэнні стратэгіі супрацоўніцтва з магчымасцю выдзялення краіне ў 2011 фінансавым годзе дадатковых крэдытных сродкаў у памеры $250 мільёнаў.

**Аляксей Арэшка, БелаПАН**

## Сяўба на мільярд долараў

**Азімыя палеглі па ўсё краіне.**

Міністэрству сельскай гаспадаркі, як заўсёды, бракуе сродкаў на правядзенне сяўбы-2010. Сёлетняя кампанія абыдзецца дзяржаве ў 3,095 трыльёна рублёў. Гэта больш за мільярд долараў у эквіваленце.

Па словах намесніка міністра Васіля Паўлоўскага, пакуль што не стае ажно $250 мільёнаў. Гэтыя грошы мусяць пайсці на закупку паліва і мінеральных угнаенняў.

Дарэчы, вялікая частка азімага жыта пацярпела гэтай зімой.

**ЯВ**


ФОТО.BYMEDIA.NET

Людзі ціснуцца нават у такія старыя маршруткі.

## Мінскія маршруткі падаражаюць да 2250 рублёў

**У абласных цэнтрах цэны ўжо ўзраслі з 1000 да 1200 рублёў.**

Камітэт па цэнаўтварэнні Мінгарвыканкама прапанаваў дазволіць маршрутачнікам павялічыць кошт праезду на 20% — да 2250 рублёў. Цяперашні максімум складае 1870 рублёў.

Пасажыры абураныя: «Трэба менш грошай міма касы праводзіць. Ніхто з кіроўцаў квіткі не выдае, вось і атрымліваецца маленькі афіцыйны даход. А калі б было нявыгадна — не ездзілі б».

Рашэнне праходзіць узгадненне ў Міністэрстве юстыцыі.

З 1 сакавіка у Беларусі на 100 рублёў падаражаў праезд у грамадскім транспарце.

**ЯВ**

СЦІСЛА

### Не ашчаджаеш — сядзі ў цемры

Урад Венесуэлы адключыў электрычнасць некалькім дзясяткам арганізацый, якія не выканалі прадпісанняў прэзідэнта Уга Чавеса аб эканоміі. У ліку адключаных — рэстараны, гатэлі, аўтасалоны, яхт-клуб і нават падраздзяленне японскай карпарацыі Sony.

### Малако пабегла

Закупачныя цэны на малако, якое закупляецца для дзяржаўных патрэб, павялічаныя ў сярэднім на 10%. Закупачныя цэны на малако «Экстра» цяпер складаюць 1000 рублёў за 1 кг, вышэйшага гатунку — 785 руб., першага гатунку — 725 руб., другога гатунку — 415 руб.

### Еўра ў Латвіі з 2014 года

Урад Латвіі вызначыў новую дату ўвядзення еўра ў краіне — 1 студзеня 2014 года. Каб рэалізаваць гэтую ідэю, краіна павінна захаваць нізкую інфляцыю і дэфіцыт бюджэту.

**ЯВ**

# Пяціпрацэнтныя крэдыты на будаўніцтва перастануць даваць?

## Што абярэ ўлада — рызыку раззлаваць мінчан у перадвыбарны год ці магчымасць пакінуць $75 мільёнаў у бюджэце?

Пастанова Мінгарвыканкама №101 — як промень святла ў цёмным царстве для мінчукоў, што стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Згодна з дакументам, атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва можа кожны «чаргавік». За 2009 год магчымасцю скарысталіся 2500 чалавек.

Але цяпер над ініцыятывай мінскіх уладаў згусціліся хмары. «Дакументы не прымаем, а калі і падасце іх, будзе адмова ў крэдыце», — безапеляцыйна кажуць у выканкамах.

### Праблемная пастанова

З часу прыняцця дакумента яго суправаджалі скандалы і непаразуменні. Спачатку высветлілася, што пастанова супярэчыць прэзідэнцкаму ўказу. У кіраўніка дзяржавы было напісана — выдаваць ільготны крэдыт, толькі калі падыдзе чарга. Між іншым, у Мінску яна дасягнула дваццаці гадоў. Але сталічныя ўлады бачылі, што новабудоўлі стаяць пустымі, таму ў нейкай ступені згадзіліся плюнуць на сацыяльны прынцып чаргі і далі «чаргавікам» карт-бланш. Маўляў, можаце будавацца — будуйцеся, а ўлада дапаможа крэдытам. Два месяцы перамоваў прывялі да кампрамісу, і рашэнне Мінгарвыканкама стала выконвацца.

Наступная праблема з'явілася пры канцы 2009 года, калі раптоўна скончыліся грошы на крэдыты ўсім ахвотным будавацца. Людзі трапілі ў непрыемную сітуацыю — прыйшоў час чарговага шматмільённага плацяжу, а дзяржава не ў стане выканаць свае абавязацельствы. Прыйшлося займаць грошы па знаёмых, пакуль «Беларусбанк» не здолеў нарэшце знайсці дадатковыя сродкі.

### Адцягвалі да апошняга

Новы год прынёс новыя складанасці. Старых «чаргавікоў» абслугоўвалі, але новым ахвотным крэдытаў не давалі. Паводле працэдуры, адміністрацыі мінскіх раёнаў мусяць на працягу месяца разгледзець дакументы. Калі ў паперах няма памылак, выканкам накіроўвае спісы «чаргавікоў» у банкаўскія філіі, тыя за тыдзень-другі заводзяць крэдытныя лініі. Працэс пайшоў толькі 17 сакавіка. Пасля двухмесячнага маўчання ўладаў. Дазвол атрымалі тыя, хто падаў дакументы ў студзені, і частка «лютаўцаў».

Варта разумець сітуацыю — людзі маюць права звярнуцца па крэдыт, толькі заключыўшы дамову з забудоўшчыкам. Такія дамовы прадугледжваюць неадкладнае ўнясенне першага плацяжу ў памеры 10—25% ад кошту кватэры. Такім чынам, «чаргавікі» спачатку плацяць $5—20 тысяч і толькі пасля вымушаны чакаць вердыкту, ці дапаможа ім дзяржава. Чаканне расцягваецца на месяцы. А час рабіць другі ці нават трэці плацёж падыходзіць няўмольна.

**Сем падводных камянёў «пазачарговага» будаўніцтва з крэдытам пад 5% гадавых на 20 гадоў:**

**1.** Разлічваць на 5–працэнтны крэдыт могуць толькі мала– і сярэднезабяспечаныя людзі (ці сем'і). Для гэтага даход на кожнага члена сям'і не мусіць перавышаць 1 мільён 185 тысяч рублёў.

**2.** Дзяржава дае крэдыт на плошчу з разліку 20 кв. м на чалавека. Астатнюю плошчу кватэры пакупнік аплачвае ўласнымі грашыма.

**3.** Крэдыт не пакрывае 100% будаванага жылля. Дзяржава выдае грошы, улічваючы кошт квадратнага метра ў доме «тыповых спажывецкіх якасцяў». Гэта ад 2,1 да 2,4 млн рублёў. Рэальна ж квадратны метр у прыватнага забудоўшчыка каштуе ад 3,1 млн і даражэй. Розніцу пакупнік кватэры аплачвае ўласнымі грашыма.

**4.** Пасля пабудовы кватэры з прыцягненнем 5–працэнтнага крэдыту вы выкрэсліваецеся з чаргі і не маеце права на будаўніцтва льготнага жылля па дзяржаўных цэнах (каля $600 за кв. м).

**5.** Перад тым як звярнуцца ў выканкам з просьбай аб выдачы крэдыту, трэба заключыць дамову з забудоўшчыкам і — у большасці выпадкаў — аплаціць 10—25% кватэры ўласнымі грашыма.

**6.** Дзяржава дае крэдыт на будаўніцтва далёка не ў кожным доме прыватнага забудоўшчыка. Спіс «дазволеных» дамоў можна ўбачыць на сайце Мінгарвыканкама minsk.gov.by, знайшоўшы «Графік будаўніцтва (рэканструкцыі) і фінансавання жылых дамоў па Мінску на 2010 год».

**7.** Калі грошай на ўнясенне сваёй абавязковай часткі не хапае, можна ўзяць яшчэ адзін крэдыт. Але пад большую стаўку — ад 17% і вышэй. Яшчэ адна цяжкая задача — даказаць, адкуль у малазабяспечанай сям'і грошы на пагашэнне адразу двух крэдытаў.

### Хто ўскочыць у апошні вагон?

Пакуль «студзеньцы» і «лютаўцы» ў эйфарыі чакаюць грошай ад банка, тыя, хто не паспеў падаць дакументы і разлічвае зрабіць гэта ў найбліжэйшы час, кусаюць локці.

Супрацоўнікі некаторых мінскіх райвыканкамаў, напрыклад Цэнтральнага, кажуць адкрытым тэкстам: «Праграма закрываецца. Дакументаў не прымаем, а калі і падасце іх, то будзе стопрацэнтная адмова ў крэдыце». Іншыя, як у Фрунзенскім, раяць «чакаць і асабліва не настройвацца на станоўчы вынік».

Сярод іншых варыянтаў разгортвання падзей ёсць і такі — чарга фактычна будзе падзелена на «шчаслівчыкаў» і «няўдачнікаў».

Прынцып падзелу — год пастаноўкі ў спіс «чаргавікоў». Тыя, хто, напрыклад, чакае кватэру ад 1989 да 2000 года, зможа разлічваць на пазачарговае будаўніцтва і 5-працэнтны крэдыт. Астатнія — не. Давялося чуць і пра іншую магчымую мяжу — 2004 год. Пры любым з такіх варыянтаў дзяленне «на касты» выклікае яшчэ большую незадаволенасць грамадзян.

Разглядаецца і ідэя павелічэння крэдытнай стаўкі — да 7% ці нават да 10%. Крэдыт усё адно будзе называцца льготным, але частка ахвотных з невялікім заробкам адсячэцца ад спісу прэтэндэнтаў на неадкладнае будаўніцтва.



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Прыблізныя падлікі кошту кватэр*

**Прыклад 1:**
**Мужчына будуе аднапакаёвую кватэру плошчай 45 кв.м**
Кошт кватэры — 3 150 000 (кошт квадратнага метра кватэры) × 45 (колькасць квадратных метраў) = 141,8 мільёна рублёў ($47,3 тысячы)
Магчымы памер крэдыту — 36 (норма квадратных метраў на аднаго чалавека ў аднапакаёвай кватэры, для іншых кватэр — 20 квадратных метраў на чалавека) × 2 400 000 (кошт квадратнага метра тыпавой дзяржаўнай кватэры) = 86,4 мільёна ($28,8 тысячы)
УЛАСНЫЯ СРОДКІ — 141,8 мільёна − 86,4 мільёна = 55,4 мільёна ($18,5 тысячы)

**Прыклад 2:**
**Муж і жонка будуюць двухпакаёвую кватэру плошчай 60 кв.м**
Кошт кватэры — 3 150 000 × 60 = 189 мільёнаў рублёў ($63 тысячы)
Магчымы памер крэдыту — 40 × 2 400 000 = 96 мільёнаў ($32 тысячы)
УЛАСНЫЯ СРОДКІ — 189 мільёнаў − 96 мільёнаў = 93 мільёны ($31 тысяча)

**Прыклад 3:**
**Муж, жонка і дзіця будуюць аднапакаёвую кватэру плошчай 45 кв.м**
Кошт кватэры — 3 150 000 × 45 = 141,8 мільёна рублёў ($47,3 тысячы)
Магчымы памер крэдыту — 45 × 2 400 000 = 108 мільёнаў ($36 тысяч)
УЛАСНЫЯ СРОДКІ — 141,8 мільёна − 108 мільёнаў = 33,8 мільёна ($11,3 тысячы)

**Прыклад 4:**
**Муж, жонка і дзіця будуюць двухпакаёвую кватэру плошчай 60 кв.м**
Кошт кватэры — 3 150 000 × 60 = 189 мільёнаў рублёў ($63 тысячы)
Магчымы памер крэдыту — 60 × 2 400 000 = 144 мільёны ($48 тысяч)
УЛАСНЫЯ СРОДКІ — 189 мільёнаў − 144 мільёны = 45 мільёнаў ($15 тысяч)

**Прыклад 5:**
**Муж, жонка і дзіця будуюць трохпакаёвую кватэру плошчай 90 кв.м**
Кошт кватэры — 3 150 000 × 90 = 283,5 мільёна рублёў ($94,5 тысячы)
Магчымы памер крэдыту — 60 × 2 400 000 = 144 мільёны ($48 тысяч)
УЛАСНЫЯ СРОДКІ — 283,5 мільёна − 144 мільёны = 139,5 мільёна ($46,5 тысячы)

*зыходная сітуацыя — кватэра, якая будуецца прыватным забудоўшчыкам у спальным раёне Мінска ў 12–павярховым доме, для людзей, якія стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў.

### Кропля пазітыву

Пакуль ніхто з высокіх чыноўнікаў публічна не пацвердзіў чутак пра згортванне праграмы. Перадвыбарныя гады заўсёды бываюць часам залагоджвання насельніцтва. Той чыноўнік, хто задумае іншую жыллёвую рэформу, нявыгадную для людзей, падкладзе свінню Лукашэнку. Ці захоча нехта з іх так рызыкаваць? — рытарычнае пытанне.

Кошт 5-працэнтных крэдытаў на пазачарговае будаўніцтва не самы высокі для дзяржавы. Нават калі палічыць, што ўсе леташнія крэдыты атрымлівалі сем'і з трох чалавек — а яны прэтэндавалі на найбольшыя грошы, — кошт адной дапамогі складаў $30 тысяч. Агулам — $75 мільёнаў. Якія неўзабаве пачнуць вяртацца ў бюджэт.

**Яўген Васількоў**

# Ці будзе у 2010 годзе даражэць жыллё?

## Аналіз рынку нерухомасці Беларусі.

Рыэлтары, забудоўшчыкі, прадстаўнікі міністэрстваў у адзін голас кажуць, што зараз стан рынку выправіўся і жытло будзе толькі расці ў цане. Гэта значыць варта купляць сёння, бо заўтра будзе даражэйшым. Ці так гэта? Паспрабуем разабрацца.

На сёння на рынку нерухомасці Беларусі склалася наступная карціна. Цяпер 1 кв. метр жытла ў Мінску каштуе $1300—1700 на другасным рынку (калі разглядаць кошты на навабуды, дык $900—1500), у Гродне й Брэсце — $700—1300, у Магілёве, Гомелі, Віцебску — $800—1200, у Рагачове — $460—590, у Полацку — $570—790.

Далейшы аналіз па рынку нерухомасці будзем весці па Мінску, але дынаміка змянення коштаў на кватэры па ўсёй Беларусі прыкладна аднолькавая.

Спачатку прааналізуем, якія цэны на квадратны метр былі ў Мінску ў розныя гады.

Пунктам адліку на арганізаваным рынку нерухомасці возьмем паслякрызісны 1999 год. Тады квадратны метр адпакаёвай кватэры (35 кв.м) у спальным мікрараёне каштаваў у сярэднім $350. Але прапанова кватэр амаль у 5 разоў перавышала попыт (14 563 супраць 3 307). Таму кошты на кватэры працягвалі падаць. І ўжо ў 2000 годзе сярэдні кошт квадратнага метра дасягнуў $275. Зараз цяжка ўявіць, але аднапакаёвая кватэра ў Чыжоўцы тады каштавала $9500.

З 2001 года назіраецца рост на рынку жытла. І вось ужо ў 2002 годзе сярэдні кошт кв. м жытла адпакаёўкі ў Мінску складае $360. Усе наступныя гады назіраецца тэндэнцыя росту коштаў квадратнага метра: 2003 г. — 450 дал.\кв.м, 2004 г. — 620 дал.\кв.м, 2005 г. — 900 дал.\кв.м, 2006 г. — 1100 дал.\кв.м, 2007 г. — 1 900 дал.\кв.м, 2008 г. — 2 100 дал.\кв.м.

**Цэны на тыповыя аднапакаёўкі ў Мінску, даляраў за кв.м**

| 1999 | 2000 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 350 | 275 | 360 | 450 | 620 | 900 | 1100 | 1900 | 2100 | 1500 | ? |

Свайго апагея кошты на 1 кв.м жытла дасягнулі летам 2008 года. Далейшы рост цэн быў прыпынены сусветным крызісам.

Ужо летам 2009 года сярэдні кошт кв.м упаў да $1500. І ўжо сёння аднапакаёвая кватэра (35 кв.м) у панэльным доме ў спальным раёне Мінска каштуе $43—46 тысяч.

З 2001 да 2008 г. асноўнымі фактарамі змены цэнаў былі рост пакупной здольнасці ўсіх груп насельніцтва, даступнасць крэдытавання, і што асабліва важна, — павелічэнне памераў льготнага крэдытавання.

На пачатку 2009 года большасць банкаў прыпынілі выдачу крэдытаў, з лета наглядалася паступовае аднаўленне крэдытавання, але працэнтавыя стаўкі дасягаюць 25% гадавых. Большасць банкаў сутыкаецца з ростам праблемных крэдытаў.

У такой сітуацыі ўсё будзе залежаць ад дынамікі заробкаў. Яны на сёння амаль не растуць, Але планы развіцця эканомікі на 2010 год абяцаюць іх рост. Калі яны пойдуць у рэзкі рост перад выбарамі, можна будзе чакаць і росту цэнаў на жытло. Калі яны застапарацца, тады кошт кватэраў нават на пару працэнтаў упадзе.

**Віктар Яўмененка**

# Патоп у Заслаўі

**Доўгачаканае пацяпленне прынесла беларусам клопат у выглядзе вялікай вады. Пад рызыкай затаплення — 80 паселішчаў.**

Сёлета зіма стварыла ўсе ўмовы для вялікай вясновай паводкі: траскучыя маразы скавалі грунт, таму зямля ня хутка зможа ўвабраць талую ваду. А вады гэтай будзе многа, бо зіма гэтая выдалася не толькі марозная, але і надзвычай снежная.

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях падрыхтавала прагноз на гэтую вясну. Паводле найгоршага сцэнару, вясновае разводдзе можа закрануць 77 паселішчаў, у якіх пражывае каля 55 тысяч чалавек. Пад эвакуацыю могуць трапіць каля 4 тысяч чалавек. З іх каля паловы пражывае на Гродзеншчыне — тут да эвакуацыі рыхтуецца каля 1700 чалавек у 40 населеных пунктах. Сярод вялікіх гарадоў найбольш неспрыяльная сітуацыя можа стварыцца ў Гродне, Барысаве і Бабруйску. У апошнім, напрыклад, чакаецца пад'ём вады ў Бярэзіне да 6 метраў. Зрэшты, узровень вады ў большасці беларускіх рэк гэтай вясной будзе вышэйшы за сярэдні. Апошняя буйная паводка ў Беларусі здарылася пры канцы 1970-х.

Тым часам вялікая вада прыйшла ў прыгарады сталіцы. У ноч на панядзелак 22 сакавіка 2010 г. затапіла некаторыя вуліцы ў Заслаўі і Ратамцы. У Заслаўі найбольш пацярпеў квартал вуліц Дачнай і Першамайскай — нарабіла бяды рачулка Княгінька. «Учора дзеці дапамаглі насенку вынесці са склепа. А сёння там ужо басейн», — расказвае старэнькая бабуля. У дамах у мясцовых жыхароў пакуль суха.

**Сямён Печанко**

**У красавіку анамалій не чакаецца**

Паводле Гідраметэацэнтра, у красавіку тэмпература паветра будзе ў межах кліматычнай нормы — 4—7 градусаў цяпла. Месячная колькасць ападкаў таксама прагназуецца ў межах нормы. Першая пяцідзёнка красавіка будзе халаднаватая, з ападкамі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу.

Пасля пачне цяплець. Да канца месяца начная тэмпература паветра складзе ўжо 4—9 градусаў вышэй за нуль. Дзённая тэмпература паветра ў сярэдзіне красавіка будзе каля 15 градусаў, а бліжэй за канца месяца можа дасягнуць і 20 градусаў цяпла.

**БЕЛТА**



СЯМЁН ПЕЧАНКО

## З новых пасведчанняў кіроўцы выкінулі беларускую мову

**Пераход на «еўрапейскія нормы» прывёў да здачы нацыянальных пазіцый.**

З ліпеня 2010 года ў Беларусі пачнуць выдаваць правы кіроўцы новага ўзору. Старыя пасведчанні будуць дзейсныя да тэрміну, пазначанага на іх, але трапіць у Еўропу з імі будзе немагчыма. З 2011 года патрабаванні Еўрасаюза становяцца больш жорсткімі, а беларускія новыя правы якраз будуць адпавядаць усім нормам.

Калі параўнаць правы новага ўзору са старымі, бачна істотная змена — пасведчанні пераклалі на расійскую мову.

Раней назвы граф «Прозвішча», «Імя», «Месца жыхарства», «Дата выдачы», «Сапраўдны да» і іншыя былі напісаны па-беларуску, а іх змест — па-расійску і па-англійску, напрыклад «ГЛЕБ/HLEB», «АЛЕКСАНДР/ALAKSANDR». Па жаданні кіроўцы расійская частка магла быць перакладзеная на беларускую мову. А вось адваротная частка, з тлумачэннем катэгорый транспартных сродкаў, была надрукавана цалкам па-беларуску.

У новых правах уся інфармацыя — і графы, і дадзеныя ў іх — прадстаўленая на дзвюх мовах. Расійскай і англійскай. Па-беларуску засталося ўсяго чатыры словы — «Рэспубліка Беларусь» і «Вадзіцельскае пасведчанне».

Ці то ДАІшнікі вырашылі, што кіроўца мусіць цурацца беларускай мовы, трапіўшы ў Еўропу, ці то да ведамства дайшла праграма суцэльнай русіфікацыі грамадства.

**Яўген Васількоў**



## Філарэт адзначыў сваё 75-годдзе ў Маскве

21 сакавіка Мітрапаліту Філарэту споўнілася 75 гадоў. Юбілей ён адзначаў у Маскве. Уладыка атрымаў віншаванні ад прэзідэнтаў Лукашэнкі і Мядзведзева.

**Мікола Бугай**

## Алесь Міхалевіч зацвердзіў лагатып сваёй прэзідэнцкай кампаніі

Палітык Алесь Міхалевіч прэзентаваў лагатып сваёй прэзідэнцкай кампаніі. Лагатып на трох мовах — беларускай, расійскай і англійскай. Слоганам кампаніі стане «У нас усё атрымаецца».

«Лагатып распрацаваны Студыяй дызайну «RedStyle». Як і ў шмат якіх іншых маскоўскіх фірмах, адзін з заснавальнікаў гэтай студыі з'яўляецца беларусам. Лагатып будзе размяшчацца на ўсіх відах прадукцыі, якая будзе выпускацца маім штабам», — зазначае палітык.

**ЗП**

## Арыштаваны кіраўнік прадстаўніцтва ў Беларусі расійскага ААТ «Атамэнергаэкспарт»

Пракуратура Маскоўскага раёна Мінска распачала справу па ч. 4 арт. 210 КК (крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі) у адносінах да кіраўніка прадстаўніцтва ў Беларусі расійскага ААТ «Атамэнергаэкспарт». Ён падазраецца ў тым, што, злоўжываючы службовымі паўнамоцтвамі, скраў 60 млн рублёў.

Справу, якая была распачата 9 сакавіка, вядзе следчы аддзел папярэдняга расследавання УУС Маскоўскага раёна Мінска.

**ЗП**

«Станцыі яшчэ няма, а крадзяжы ўжо ёсць».

**Віталь з Мінска. З каментароў на nn.by**

АЎТА

## Беларусь — самая «аўтамабілізаваная» краіна ў СНД

**Асацыяцыя аўтавытворцаў Еўропы назвала Нямеччыну самай забяспечанай аўтамабілямі краінай. У СНД першае месца па гэтым паказніку займае Беларусь.**

У Нямеччыне на адну тысячу жыхароў краіны прыпадае 563 легкавікі. Справа ў тым, што там даступныя кошты на аўтамабілі нацыянальнай вытворчасці, а таксама эфектыўная сістэма дзяржаўных ільготаў і праграмаў крэдытавання, якія дазваляюць нават малазабяспечаным людзям купляць аўто.

На другім месцы — Італія. Там 548 аўто на тысячу жыхароў. Замыкае тройку лідэраў Аўстрыя — 510 машын. Сярэдні ж паказнік па Заходняй Еўропе — 508 аўто на тысячу жыхароў, а ў краінах-пачаткоўцах ЕС — па 307 машын.

Сярод краін СНД па колькасці аўтамабіляў першай стаіць Беларусь: 261 аўто на тысячу. Хоць эксперты адзначаюць, што аўтапарк у нашай краіне, мякка кажучы, не вылучаецца якасцю і навізной.

**СМ**



PHOTO.BYMEDIA.NET

СЦІПЛА

### На вадасховішчы Дразды патанулі двое дайвераў

Няшчасны выпадак адбыўся днём 21 сакавіка. Пяцёра мінчукоў вырашылі паплаваць ля дамбы на вадасховішчы Дразды, што пад Мінскам. Двое пераапрануліся ў гідракасцюмы і пачалі апусканне, астатнія пайшлі пераапранацца. Паводле папярэдніх звестак, моцная плынь кінула дайвераў да кратаў дамбы і яны не змаглі самастойна выбрацца з вады.

### Нашы — «найлепшыя»

Упершыню амаль за дзесяць гадоў быў здзейснены пабег з маскоўскай турмы Бутырка. Як паведамляюць, уцёк грамадзянін Беларусі Віталь Астроўскі 1984 года нараджэння — ён падазраецца ў крадзяжы. Абставіны ўцёкаў невядомыя.

У апошні раз з Бутырскага ізалятара злачынцам удалося збегчы ў верасні 2001 года. Тады з турмы збеглі асуджаныя да пажыццёвага зняволення Уладзімір Жэлезогла і Анатоль Кулікоў, а таксама іх сукамернік Барыс Безотчаства.

Тады зняволеным удалося прабіць дзірку ў падлозе, праз гэты лаз трапіць у старыя падвалы Бутырскага замка і выбрацца на волю.

### Пенсіянеры не падзялілі тэлевізар: жонка зарэзала мужа

Пракуратурай Кастрычніцкага раёна Магілёва распачата справа па ч. 3 арт. 147 Крымінальнага кодэкса ў дачыненні да 67-гадовай жыхаркі. Пенсіянерка пасварылася з мужам праз прагляд тэлепраграм і ўдарыла яго нажом у спіну. 70-гадовы муж памёр на месцы.

**СГ; БелаПАН**

# Ідэалогія, заточаная пад элегантныя перамогі

Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Зладжаны ў сталіцы двухдзённы семінар па ідэалогіі звёўся да банальных заклінанняў: пазбаўляцца фармалізму, дайсці да кожнага. Нафталін часоў КПСС. Але былі і красамоўныя заявы. Вось, напрыклад, устаноўка кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Уладзіміра Макея наконт БРСМ: «Няма патрэбы прымусова ставіць пад сцягі арганізацыі татальна ўсю моладзь». Ноу комэнт, практыка ідэалагічнага ахопу юных акрэслена болей чым вычарпальна. Хіба што варта было пра «Белую Русь» дадаць. Ці там яшчэ план не выканалі?

Высокі начальнік падкрэсліў, што галоўнае для дзяржаўнай ідэалогіі — кансалідацыя нацыі. Але цягам двух дзён з той самай трыбуны гучаў рэфрэн пра ідэалагічных працаўнікаў, якім трэба няспынна даваць адлуп. А яны хто — марсіяне? Ці тых, хто прынцыпова не згодны з цяперашнім курсам, часткай нацыі лічыць не варта?

Двухсэнсоўна прагучаў і фармальна прагрэсіўны заклік Уладзіміра Макея, каб вертыкальшчыкі не цураліся працаваць з недзяржаўнай прэсай. Маўляў, так робяць у Маладзечне: даюць інфармацыю, дзейнічаюць «мяккім, спакойным перакананнем».

Але вось вам маралітэ: «І ў выніку такой стратэгіі людзі (відавочна, маюцца на ўвазе недзяржаўныя журналісты. — А.К.) часта пераходзяць на бок улады. Таму гэты вопыт Маладзечанскага раёна трэба пераймаць усім мясцовым органам улады краіны».

Учытайцеся: міжволі ўлада вербальна аддзяляе сябе ад людзей.

Галоўнае ж — там, наверсе, не хочуць разумець элементарнага: нармальная прэса не мусіць быць на баку дзяржапарату, яна акурат заклікана ажыццяўляць над ім грамадскі кантроль. Нармальная прэса — у апазіцыі да любой улады.

Ці вось яшчэ: «Нашы каналы сёння ў асноўным кантралююць тэлевізійную прастору ў Беларусі. Але трэба разумець, што гэта становішча дасягнута дзякуючы магутнай падтрымцы дзяржавы, якая стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця нацыянальнага тэлебачання. Таму дзяржава мае права разлічваць на сур'ёзную аддачу».

> «І ў выніку такой стратэгіі людзі часта пераходзяць на бок улады».

Во як: дзяржава! Чытай: вертыкаль, апарат, начальства. А чаму не гледачы, у тым ліку і апазіцыйных поглядаў? Яны ж таксама плацяць падаткі на «магутную падтрымку» электронных медый.

І нарэшце, вось які крытэр эфектыўнасці ідэалагічнай працы ставіць на першае месца кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта: «вынікі галасавання ў ходзе палітычных кампаній».

Тут расшыфроўка адназначная: каб як мага болей электарату галасавала за праўладных кандыдатаў і найменей — за апазіцыю. Гэтая ўстаноўка — абсалютны нонсэнс для нармальных дзяржаў.

Глядзіце, ёсць, напрыклад, амерыканская ідэя. І яна ні на каліва не залежыць ад таго, хто пераможа там на прэзідэнцкіх выбарах. І ў Брытаніі то кансерватары кіруюць, а лейбарысты ў апазіцыі, то наадварот. Ад гэтага ідэі, на якіх грунтуецца брытанскі лад жыцця, зусім не куляюцца. Так усюды ў нармальных дэмакратыях.

Там, калі хочаце, сам прынцып ратацыі кіроўных эліт — адна з галоўных ідэй. Справа ж чыноўнікаў — забяспечваць працэс канкурэнтнай палітыкі, а не закаркоўваць яго.

У нас жа з трыбуны семінара выказваецца надзея, што «экзамен, які нам з вамі і ўсёй уладзе трэба будзе трымаць менш як праз год, мы вытрымаем з гонарам». А інакш, значыць, капец.

Як бачым, высокія чыны праз слова прагаворваюцца, што ўся дзяржаўная ідэалогія заточаная пад элегантныя перамогі самі ведаеце каго. На такім грунце трымаецца і дабрабыт самой вертыкалі. Усё элементарна.

Але пры гэтым яшчэ — прэтэнзіі на нейкую канцэптуальнасць, наморшчванне лбоў!

Галеча філасофіі, як казаў класік.

**Макей пра Герашчанку: Не згодны з палітыкай краіны — не месца ў дзяржслужбе**

«На жаль, часам трапляюцца людзі, якія, знаходзячыся на дзяржаўнай службе, публічна пачынаюць займаць, мякка кажучы, дзіўную пазіцыю, якая ідзе ў разрэз з палітыкай і інтарэсамі Беларусі», — адзначыў Уладзімір Макей на рэспубліканскім семінары–нарадзе ідэалагічных работнікаў.

«Няўжо дазволена нейкаму супрацоўніку гарадскога аддзела па справах моладзі разгортваць ў інтэрнэце кампанію, з якой вынікае, што ў Беларусі ледзь не прыгнятаюць расійцаў і прыгнятаюць расійскую мову? Такі выпадак быў нядаўна ў Віцебскай вобласці», — прывёў прыклад кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі.

Ён падкрэсліў: «Публічныя выступленні дзяржаўнага чыноўніка не могуць быць выключна яго прыватнай справай. Ніхто не забараняе выказваць уласнае меркаванне і адстойваць яго, аднак ва ўмовах вострага сацыяльнага проціборства прадстаўнікі дзяржапарату не могуць станавіцца на альтэрнатыўную пазіцыю. Чалавек павінен вызначыцца: калі ён не згодны з палітыкай, якая праводзіцца ў краіне, значыць, яму не месца ў дзяржслужбе».

Нагадаем, што пасля публікацыі ў «НН» артыкула пра выказванні віцебскага чыноўніка Андрэя Герашчанкі расійскаму парталу «Материк», апошні развіў цэлую тэорыю змовы, назваўшы сярод іншага Уладзіміра Макея «идейно близким человеком» «в литвинских кругах». Выказванні Андрэя Герашчанкі знайшлі свой водгук у ягонай працоўнай кар'еры. Спачатку яму прапанавалі спыніць працоўны кантракт, а потым вынеслі вымову за парушэнне нормаў службовай этыкі.

**СП**

# Спадары каментатары

Піша **Віталь Тарас**.

Гвалтоўныя дзеянні міліцыі ў адносінах да журналістаў «Народнай волі», інтэрнэт-выдання «Хартыя'97» выклікалі адэкватны рэзананс на Захадзе. На жаль, рэакцыя ў самой Беларусі даволі млявая. Грамадства прызвычаілася і робіць выгляд, што не заўважае.

Але я не пра гэта. Я пра некаторыя каментары, якія з'явіліся на папулярных інтэрнэт-сайтах, што трымаюцца незалежніцкіх і дэмакратычных пазіцый. Не буду называць гэтыя рэсурсы, бо справа не ў іх, а ў рэакцыі пэўнай часткі аўдыторыі.

Вось, напрыклад, адзін з першых тыповых водгукаў да фатаграфій з Натальляй Радзінай пасля іх публікацыі: «А дзе фінгал?» (Гэта ў сувязі з інфармацыяй, што супрацоўнік міліцыі ўдарыў журналістку.)

Другі характэрны водгук прыйшоў адразу пасля прэс-канферэнцыі Радзінай, Саннікава, Халіп ў сядзібе партыі БНФ: «Гэта іх нам прапануюць у якасці новых герояў?». Ну, і далей, зразумела, пра прэзідэнцкія выбары, пра «піяр» і г.д.

Лягчэй за ўсё было б сказаць, што тыя каментары пішуць «брыгаднікі» на замову спецслужбаў ці што гэта нейкія надзвычай рэдкія выкадкі. На жаль, іх не так і мала. І галоўнае, стылістыка многіх «каментаў» паказвае: іх аўтары пішуць, як казаў паэт, па загадзе ўласнага сэрца.

> Вось тыповы водгук да фатаграфій з Натальляй Радзінай: «А дзе фінгал?»

І пішуць яны не толькі пра журналістаў, якія апынуліся цяпер у цэнтры грамадскай увагі, але ўвогуле пра ўсіх заўважных людзей. Ананімы ў сваіх каментах любяць прыпісваць аб'ектам крытыкі самыя горшыя матывы — відаць, зыходзячы з уласнага жыццёвага досведу.

Я не выступаю за цэнзуру каментароў — за выключэннем ненарматыўнай лексікі. Усе маюць права выказацца. (Мне, напрыклад, не падабаецца, што на сайце той самай «Хартыі» публікуюцца пераважна водгукі, якія супадаюць з думкай рэдакцыі і амаль ніколі — негатыўныя ці хоць бы палемічныя. Але гэта не мае дачынення да тэмы.)

Мне хацелася б — хоць я і разумею ўсю марнасць гэтых спадзяванняў — каб спадары каментатары, якія лічаць сябе, несумненна, людзьмі годнымі і інтэлектуальнымі, зразумелі адну простую рэч.

Калі яны пішуць: «дзе фінгал?», то яны мала чым адрозніваюцца ад міліцыянера, які гвалтам урываецца ў кватэру журналісткі. Ці ад таго амонаўца, які некалі публічна ўдарыў у твар жонку зніклага журналіста Змітра Завадскага на Кастрычніцкай плошчы.

Вам могуць падабацца ці не падабацца асобныя палітыкі і журналісты. Але калі адбываецца гвалт над чалавекам, непрыстойна блюзнерыць: «А, ён, мабыць, проста вырашыў сябе прапіярыць, каб пра яго напісалі, што ён герой!»

Пастаўце сябе спачатку на месца гэтых людзей — ці хацелі б вы, каб вас прапіярылі падобным чынам і зрабілі з вас героя?

**baj.by**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Наталля Радзіна з падбітым вокам.

## БЕЗ КАМЕНТАРОЎ

**Ці ёсць у Чэхіі, напрыклад, аналаг АМАПа?**

— У нас такіх падраздзяленняў няма. У нас вельмі маленькае падраздзяленне хуткага рэагавання, яно выкарыстоўваецца толькі супраць вельмі небяспечных парушальнікаў, якія здзейснілі вельмі небяспечныя злачынствы. Ніякіх іншых падобных да АМАПа падраздзяленняў у нас няма. Існуе гарадская паліцыя, якая падпарадкоўваецца мэру, але яна не мае вялікіх паўнамоцтваў — глядзіць за парадкам на вуліцах і транспартам.

**У інтэрв'ю gazeta.ru Ян Румл, былы дысідэнт, які пасля пераменаў займаўся рэфармаваннем сістэмы Міністэрства ўнутраных справаў Чэхіі. Інтэрв'ю з нагоды яго ўдзелу ў падрыхтоўцы рэформы МУС у Расіі.**

# Някляеў: я не Казулін і не Мілінкевіч

17 сакавіка стала вядома, што вечарына з нагоды выхаду 50 тамоў серыі «Беларускі кнігазбор» адмененая. Адміністрацыя Палаца мастацтва спаслалася на «тэхнічныя прычыны». Але паэт **Уладзімір Някляеў**, насуперак забароне, пачаў імпрэзу ў фае будынка, куды сабралася сотня гасцей.

**«НН»: Вы пайшлі на канфрантацыю, правёўшы імпрэзу перад зачыненай залай. Ці не бераце вы на сябе ролю Казуліна, але ў культуры?**

**УН:** Я не збіраюся браць на сябе ні ролю Казуліна, ні Мілінкевіча. Мне дастаткова ролі Някляева.

**«НН»: Забарона імпрэзы адбылася праз распачатую Вамі кампанію «Гавары праўду»?**

**Уладзімір Някляеў:** Мне не дакладвалі. «Кнігазбору» адміністрацыя палаца закідала тое, што прэзентацыя насамрэч будзе не 50 тамоў, а 52-х. І апошні — гэта том Някляева. Маўляў, іх хацелі падмануць. Але гэта ў прыватнай размове.

**«НН»: Вы неяк сказалі, што супраць усяго нацыянальнага Лукашэнку настроіў Замяталін. Сёння гэты чалавек не мае ўплыву. Але ціск на беларускамоўную культуру працягваецца. Чаму?**

**УН:** Бо Лукашэнка аддаў кантроль над структурамі: ад спецслужбаў да ідэалагічных структур. І лейцы падхапілі іншыя, хто тузаць імі не ўмее.

**Гутарыў КМ**

# Знікненне губернатара

Працяг са старонкі 1.

Яшчэ большы розгалас у Гродне выклікала раптоўнае знікненне У.Саўчанкі. Яго заўважылі 11 сакавіка. А ўжо 12-га горад літаральна стаяў на вушах. Папулярны гарадзенскі інтэрнэт-рэсурс s13 нават змясціў статыстыку запытаў на сваім сайце — згодна з ёй першыя дзесяць пазіцый трывала ўтрымлівалі словы «Саўчанка, адстаўка, самагубства».

З таго часу прайшло ўжо амаль два тыдні, а пэўных звестак пра лёс Саўчанкі так і няма. Дом, які займала яго сям'я, раптоўна апусцеў, а чуткі аб яго смерці сыходзілі нават ад выканкамаўскіх чыноўнікаў.

Версій у гараджан было шмат. Адны сцвярджалі, што У.Саўчанка застрэліўся, папярэджаны пра непазбежнасць крымінальнай справы супраць яго (папулярнасці гэтай версіі дадае гісторыя з былым кіраўніком гродзенскай міліцыі — Г.Хацько, якога аб'явілі ў вышук). Менш папулярная версія — што былы кіраўнік вобласці проста вярнуўся з сям'ёй у родны Магілёў і там чакае новага прызначэння.

Паводле інфармацыі «НН», ні першая версія, ні другая не праўдзівыя. Ёсць падставы меркаваць, што цяпер У.Саўчанка знаходзіцца ў адной з мінскіх клінік на тэрміновым лекаванні. Гэта супадае з версіяй, агучанай падчас суда над ваўкавыскім прадпрымальнікам Аўтуховічам. 16 сакавіка У.Саўчанка накіраваў у суд заяву, дзе адзначыў, што знаходзіцца на лячэнні і просіць разглядаць справу ў яго адсутнасць.

Невядомымі застаюцца прычыны раптоўнай хваробы. Ніякіх афіцыйных тлумачэнняў няма. Адны чуткі, якія абмяркоўваюць і ў аблвыканкаме, і на рынках. Людзі перакананыя, што да адстаўкі гродзенскага губернатара мае дачыненне звышпаспяховы бізнэс яго сына. Нібыта менавіта ў выніку пагрозы разбіральніцтва Саўчанка і трапіў у шпіталь.

У Гродзенскім аблвыканкаме ніякай інфармацыі пра свайго былога начальніка не даюць, спасылаючыся на яе адсутнасць. Як не ведаюць нічога і аб кандыдатуры новага кіраўніка вобласці.

Нягледзячы на доўгі стаж працы, Саўчанка заставаўся на Гарадзеншчыне чужаком.

Што цікава, у Брэсце невядомыя крыніцы таксама распускаюць чуткі пра адстаўку старшыні аблвыканкама. Маўляў, дні Канстанціна Сумара таксама злічаныя.

**Алесь Пілецкі**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Уладзімір Саўчанка**

нар. у 1952 у Магілёўскай вобласці. Скончыў Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію па спецыяльнасці інжынер-землеўпарадчык. Шмат гадоў узначальваў калгас у Круглянскім раёне, працаваў на пасадзе старшыні Круглянскага райвыканкама і намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама. Працаваў першым намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама — займаўся пытаннямі аграпрамысловага комплексу. У лютым 2001 пасля смерці Аляксандра Дубко прызначаны в.а. старшыні Гродзенскага аблвыканкама. Ад 29 сакавіка 2001 старшыня Гродзенскага аблвыканкама.

**«Саўчанка — хам»**

Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенку абвінавачваюць у падрыхтоўцы тэракта супраць старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі.

Падчас сваіх паказанняў Асіпенка даў сваю характарыстыку высокаму чыноўніку. «Саўчанка прыязджаў у Ваўкавыск у 2003 годзе. Заязджаў на базу да Мікалая Аўтуховіча, калі там праходзіла галадоўка пратэсту».

Следчы Эльдар Сафараў запытаўся, што абвінавачаны можа сказаць пра «губернатара».

«Прыехаў і пачаў лаяцца матам. Хам», — зрабіў кароткі вывад У.Асіпенка.

ЗП



**Генерал Хацько ўцёк у Нарвегію?**

Паводле апошніх чутак, былы начальнік Гродзенскай абласной міліцыі генерал Генадзь Хацько збег у Нарвегію.

Міліцэйскі чыноўнік знік у лютым, калі на яго завялі крымінальную справу за перавышэнне службовых паўнамоцтваў, а таксама за незаконнае будаўніцтва катэджа ў Лідскім раёне.

Дзе можа знаходзіцца генерал, хадзілі самыя розныя размовы. У Міністэрстве ўнутраных справаў таксама не выключаюць, што Хацько можа хавацца за мяжой.

ЗП

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА-версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Уладзімір Асіпенка: «З мяне хацелі зрабіць здрадніка, а з Аўтуховіча — Кастуся Каліноўскага»

**Увесь мінулы тыдзень у Вярхоўным судзе працягваўся працэс «ваўкавыскіх тэрарыстаў».**

Паказанні давалі самі абвінавачаныя: Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Асіпенка і Аляксандр Ларын, а таксама гродзенскі міліцыянт Міхал Казлоў.

## «Аўтуховіч зрабіў для Ваўкавыска больш за любую сацыяльную службу»

**Уладзімір Асіпенка (на фота ў цэнтры)** расказваў, што ў асноўным падчас следства камунікаваў с супрацоўнікам Упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю (УБАЗ) Шумейкам. Гаварылі не толькі пра справу, але і на вольныя тэмы.

Шумейка казаў, што праводзіў праверку начальніка Ваўкавыскага РАУС Сяргея Кацубы, якога зláвілі на злачыннай дзейнасці. Следчы гаварыў, што зброю Аўтуховіч набыў у Прыбалтыцы, а потым даставіў у Ваўкавыск. Дапамагаў яму ў гэтым былы дэпутат палаты, генерал Валер Фралоў.

Шумейка працягваў весці задушэўныя размовы з Асіпенкам. Ён казаў, што супраць Аўтуховіча, Ларына і Лявонава сабрана дастаткова доказаў. «Аўтуховічу не адкруціцца. Тэрмін будзе вялікі. Мы разумеем, што ты не вінаваты, але Аўтуховіч не дае паказанняў. Калі чэсна ўсё раскажаш, то выйдзеш на волю», — казаў следчы.

З санкцыі генпракурора Рыгора Васілевіча адбывалася праслухоўванне ў камеры, дзе сядзеў Асіпенка, а таксама ў кабінетах, дзе праходзілі допыты. У камеры таксама знаходзіўся адмысловы чалавек, які выцягваў Асіпенку на размовы.

«Я быў упэўнены, што знаходжуся тут па віне Аўтуховіча. Быў на яго злы. У той час мая сям'я трапіла ў вельмі складаную сітуацыю», — кажа У.Асіпенка. Зняволенаму прапанавалі гутарку з супрацоўнікам ГУБАЗ МУС Ціхінем, і Асіпенка спадзяваўся скарыстацца сваім шанцам.

Ціхіня прапанаваў Асіпенку даць інтэрв'ю для тэлебачання, дзе ён павінен быў выкрыць Аўтуховіча. Асіпенка адмовіўся, сказаўшы: «Вы зробіце з мяне здрадніка, а з Аўтуховіча — Кастуся Каліноўскага».

Спыніўся Уладзімір Асіпенка на выбарчай кампаніі 2004 года, калі ў парламент балатаваўся Аўтуховіч.

«Сабралася разумная, добрая каманда. У Ваўкавыску Аўтуховіча паважалі, гэта таленавіты чалавек, ён зрабіў для горада больш за любую сацыяльную службу. Дапамагаў дзіцячым дамам, простым людзям», — казаў У.Асіпенка.

Калі гаворка зайшла пра Ларына, то Асіпенка зазначыў, што гэты чалавек «курыў траўку».

## Ларын удаваў з сябе куст

Аляксандр Ларын, даючы паказанні, згаджаўся размаўляць толькі з пракурорам Эльдарам Сафаравым.

Ларын расказаў, што замах на «губернатара» Саўчанку ён спрабаваў здзейсніць 31 кастрычніка 2005 года. Прыкладна а 5-й раніцы ён прыбыў на тэрыторыю школы-ліцэя, дзе ўсталяваў бомбу, каб спалохаць магчымую пагоню.

Сам жа Ларын размясціўся за трыццаць метраў ад выбуховага прыстасавання. Ён стаў на пень ад бэзу і выдаваў з сябе куст, закрыўшыся камуфляжам. Потым да дома Саўчанкі пад'ехала машына з ахоўнікамі. Па словах Ларына,



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

пачынала ўжо світаць.

Мужчына вырваў чаку з гранатамёта, але страляць так і не стаў, бо забаяўся, што гэта «падстава». «Што мяне проста ці арыштуюць, ці заб'юць на месцы з гэтым гранатамётам», — сказаў зняволены.

На пытанні адвакатаў, нават свайго ці Аўтуховіча, Ларын адказваць адмаўляўся. У пракурора ж запытваўся: «Які адказ вас задаволіць?»

Ларын казаў, што ваяваў у Абхазіі. Вучыўся на снайпера. У Аўтуховіча запыталіся, ці ведаў ён пра гэта: «Калі нехта выпівае, то пачынае мне расказваць, што таксама мог ваяваць у Афганістане, і не горш за мяне. Ларын гаварыў, што ваяваў, людзей забіваў, рэзаў, з дрэваў скакаў, але я не ўспрымаў ягоных словаў сур'ёзна».

## Аўтуховіч: Адзіны вінаваты — гэта Ларын

Апошнім дапытвалі **Мікалая Аўтуховіча (на фота злева)**. «Уся мая «віна» грунтуецца на паказаннях двух сведак. Больш ніякіх доказаў няма. Я заяўляю, што не маю ніякага дачынення да падпалаў, а таксама да падрыхтоўкі тэрактаў», — зазначыў Мікалай.

«Палтарак — гэта завербаваны чалавек. Я асабіста ведаю таго міліцыянта, які вербаваў яго. Палтарак і даваў паказанні, што ў Аўтуховіча была вялікая колькасць зброі — аўтаматаў і снайперскіх вінтовак. Пасля гэтага Лукашэнка сказаў, чаму арыштавалі Аўтуховіча, бо нікому нельга незаконна захоўваць зброю. А потым з'явіўся Ларын, які кожны раз дае новыя паказанні», — зазначыў прадпрымальнік.

Хто такі гэты Палтарак, стане вядома потым, калі пачнуцца допыты сведак.

Па словах Аўтуховіча, арышт — гэта помста чыноўнікаў за ягоную антыкарупцыйную дзейнасць.

Абвінавачаны пачаў расказваць пра свае дачыненні з старшынёй Ваўкавыскага гарвыканкама Міхаілам Савельевым. «Як толькі Савельеў прыйшоў на пасаду, то сказаў, што ён чалавек прэзідэнта, і можаце рабіць з гэтага вывады. Вывады былі ў тым, што ў горадзе знікла законнасць. Савельеў не баяўся паказваць свае карыслівыя інтарэсы. Аднойчы ён запрасіў мяне на прыватную размову да сябе ў кабінет. Дзе сказаў, што ведае пра мае сувязі ў Нямеччыне і хацеў бы набыць аўтамабіль для жонкі. Я сказаў, што добра, заўтра прынясу яму прайс. Бачна, што чалавек чакаў зусім не гэтага. Мы даведаліся, што Савельеў незаконна атрымаў участак для будаўніцтва дома ў Гродне», — сказаў Аўтуховіч.

Далей расказаць гэтую гісторыю не даў суддзя Цяцюхін, які зазначыў, што яна не мае дачынення да матэрыялаў справы.

«Тут вінаваты толькі адзін чалавек, які выпрашыў змахляваць і зарабіць грошай». «Хто гэта?» — запытаўся суддзя. «Гэта Ларын», — адказаў Аўтуховіч.

Цяпер на працэсе чакаецца допыт сведак.

**Зміцер Панкавец**

# Хто ў банк нясе, а мы Шульману

Працяг са старонкі 1.

А цяпер, падчас судовых спрэчак, прынцыпова называюць адзін аднаго на «вы». Скончылася сяброўства пасля таго, як Леанід пазычыў Генадзю 60 000 даляраў. Прычым Шпілько зазначае: спачатку было не прынцыпова, ці пойдуць грошы на канцэртную дзейнасць. Бо пазычаў ён проста свайму сябру, які папрасіў дапамогі.

## Прыбытку няма, а «Ролекс» купіў

Аднак усе тэрміны сышлі, а грошай аднакурснік не аддаваў. Усё спасылаўся на няўдачы ў справах. Леанід нават пачаў цікавіцца шоу-бізнэсам, каб дапамагчы парадамі. Шульман у справы «Клас-Клуба» сябра не дапускаў, прасіў пачакаць наступнага мега-праекта, на якім дакладна ўжо заробіць. Праекты праходзілі, а грошы не з'яўляліся, і толькі множыліся аповеды пра стратныя канцэрты (напрыклад, спектакль Грышкаўца з поўнай залай гледачоў). Урэшце, Леанід не вытрымаў: падаў на сябра ў суд. Упэўнены, што грошы Шульман спусціў на багемнае жыццё.

«Калі мая жонка ідзе ў краму, я даю ёй капейкі, не хапае на халадзільнік. А ён купіў Rolex, вячэраюць у рэстаранах. Пасля адмоваў вярнуць пазыку купіў сыну машыну, няхай недарагую — $ 5—7 тыс., але ж гэта таксама грошы. Я не магу на поўдзень паехаць, а яго сын — то ў Крым, то ў Сочы. У Ізраілі жыў паўгода. На якія сродкі?» — абураецца пазоўнік.

## Суд must go on

Не ўсе пацярпелыя «крэдыторы» былі блізкімі сябрамі абвінавачанага. Многія — сябры Шпілько. Як Алег Чарткоў, дырэктар прыватнай фірмы, які бачыў Шульмана ўсяго пару разоў. Даведаўшыся ад Шпілько, што прадзюсар шукае грошы для арганізацыі канцэртаў, Чарткоў прынёс чалавеку з добрай рэпутацыяй 25 тысяч даляраў. Прычым, адзначыў пацярпелы, у 2007-м, на момант пазыкі, ён быў беспрацоўным.

«Вось вы, таварыш суддзя, за свабодныя грошы набываеце блузку, хтосьці нясе іх у банк, а я — пазычыў Шульману», — разважае Аляксей Слесарэнка, спартовец, зямляк Леаніда Шпілько. Сваю 31 тысячу даляраў «з хвосцікам» ён аддаў ледзьве знаёмаму Шульману, каб пасябраваць з «крутым» шоумэнам ды займець выгадныя сувязі сярод багатых. Думаў, калі дапаможа чалавеку за так, мо і той калі аддзячыць. А Шульман нічога маладому спартоўцу не абяцаў.

Адзіная з сямі крэдытораў, хто пазычаў грошы не пад слова гонару, а пад працэнты, — Вольга Радкевіч. Аднак і яна, кансультант па бухгалтарскім уліку, атрымала выключна галаўны боль. Вольга пазычыла 15 тысяч даляраў у свайго сябра з Расіі і аддала Шульману пад 4% у месяц. Але наварыць не ўдалося: шоу-бізнэсмэн з першага месяца абяцаныя працэнты не плаціў. І Вольга вымушаная была разлічвацца з расіянінам, дакладаючы абяцаныя працэнты з уласнай кішэні. Пасля працяглых перамоваў з элементамі істэрыкі маладая жанчына «выбіла» з прадзюсара 15 тысяч даляраў. У судзе яна патрабуе вярнуць ёй працэнты — 9600 даляраў.

Анатоль Чашэвіч, дарэктар фірмы «Рыэлці», знаёмы з Шульманам з 1990-х. Ужо тады, па словах пацярпелага, прадзюсар пачынаў свае махлярствы. Нездарма разваліўся Альтэрнатыўны тэатр, у свой час унікальны праект. Пасля ствараліся і ліквідаваліся фірмы, у назвах якіх Анатоль Чашэвіч нават заблытаўся. Ад жніўня 2004 да 2007 года Шульман арандаваў памяшканні пад офіс у фірме «Рыэлці». Аднак за арэнду плаціў нерэгулярна, тлумачыў гэта дзелавымі цяжкасцямі. Набегла 32 мільёны рублёў запазычанасці. Тады Чашэвіч, паводле яго словаў, вырашыў пазычыць сябру яшчэ 32 ўласныя мільёны рублёў на выратаванне бізнэсу. І ні «хвастоў» за арэнду, ні тае пазыкі ад Шульмана больш не пабачыў.

Кожная гісторыя — віхор эмоцый. Агульны тон: Шульман папрасіў грошай, пацярпелыя дапамаглі паважанаму чалавеку, а ён выявіўся махляром і банкрутам. Неаднойчы прагучала ад пацярпелых: не адны яны такія, ёсць людзі, якія пазычылі і яшчэ большыя сумы, але ў суд падаваць не захацелі. Іначай, відаць, паўстала б пытанне, адкуль яны самі тыя сумы ўзялі.

Апроч невяртання пазык, у справе Генадзя Шульмана значацца нявыплаты заробкаў бухгалтару і кіроўцу; запазычанасць па аплаце арэнды Мінскага лядовага палаца, Дома афіцэраў, гатэля «Мінск» за арэнду нумароў для зорак эстрады...

Пасля паказанняў пацярпелых слова далі Шульману. Яго выступу вельмі чакалі ўсе прысутныя ў зале суда. Не кожны дзень слухаеш шоу-бізнэсмэна, які, паводле абвінавачання, умудрыўся за чатыры гады дзейнасці нанесці матэрыяльную шкоду на 641,2 мільёна рублёў.

## Сто тысяч еўра — невялікія грошы

Пачаў Шульман ад Адама. І гаварыў ён тры дні. Трэба адзначыць, харызма ў гэтага чалавека такая, што многія прысутныя, паслухаўшы яго, былі б гатовыя хоць зараз пазычыць яму. Хоць перад гэтым чулі сведчанні пацярпелых. Шульман распавядаў пра тое, як у 1987 годзе, скончыўшы Інстытут культуры, пачаў займацца канцэртна-гастрольнай дзейнасцю ў камсамольскім моладзевым цэнтры «Крыніца». Потым, калі развалі́ўся Савецкі Саюз, год працаваў у Чырвоным крыжы. Таксама па лініі канцэртна-гастрольнай дзейнасці. Урэшце Шульмана запрасілі ў Альтэрнатыўны тэатр. Менавіта там і ўтварылася кампанія пад назваю «Клас-Клуб».

Два разы на месяц у Мінск запрашалі вядомых артыстаў савецкага тэатра і кіно (напрыклад, Акуджаву, Смактуноўскага). У «Клас-Клуб» прыходзілі дзелавыя людзі з жонкамі адпачыць пасля цяжкага працоўнага дня. Для іх ладзіліся тэатралізаваныя шоу. Генадзь Шульман асабліва адзначае, як гэта было нова і неардынарна, нават з Міністэрства культуры хвалілі. Да 1997 года яны працавалі як прадзюсарскі цэнтр Альтэрнатыўнага тэатра.



Генадзь Шульман. Фота з сайта «Аднакласнікі».

У 1997 годзе «Прыёрбанк» выкупіў памяшканні, дзе месціліся Альтэрнатыўны тэатр і «Клас-Клуб». Кампаніі заламілі арэнду, і яна вымушаная была сысці з будынка. І ўжо ў 1998 годзе «Клас-Клуб» пачаў бурліва развівацца. Сярод першых запрошаных ім у Мінск зорак былі куміры 80-х Scorpions. Справы кампаніі ішлі выдатна.

**— Генадзь Міхайлавіч, ці адмаўляліся вы калі-небудзь ад грошай? — спытаў суддзя.**
**Шульман трохі задумаўся:**
**— Ведаеце, адмаўляўся.**

Аднак у маі 2006-га як гром з яснага неба выйшаў указ прэзідэнта аб канцэртна-гастрольнай дзейнасці. Заднімі датамі, ад 1 студзеня, усе прыватныя кампаніі мусілі сплаціць ПДВ з прыбытку. У фірмы Шульмана ўзнікла незапланаваная дзірка ў бюджэце у памеры 180 млн рублёў.

Да закрыцця гадавога балансу, казаў Шульман, удалося кампенсаваць толькі трэціну сумы. І было прынятае рашэнне аб банкруцтве. Праз месяц сын Шульмана, на той момант студэнт, стаў заснавальнікам новай кампаніі «Клас-Клуб Інтэртэймэнт».

Паралельна з ліквідацыяй фірмы Шульман вырашае паспрабаваць сябе ў сталіцы Расіі: «Пасля правядзення перамоваў у пачатку 2007-га распачалі першы праект. Гэта было зроблена на сродкі, пазычаныя ў Шпілько і іншых, таксама трохі было маіх грошай. У Маскве я пакінуў каля 100 тыс. еўра — гэта былі невялікія грошы. Для прыкладу, мой фінансавы партнёр уклаў каля 3 мільёнаў даляраў у праект, які мы мусілі рабіць разам, — канцэрт Джорджа Майкла ў Алімпійскім. На жаль, у Маскве праца не пайшла».

Масквічы «праявілі свае амбіцыі», і Шульман апынуўся за бортам расійскага шоу-бізнэсу. Вярнуўся ў Мінск. Закруціў тут усё па новай. У 2007 закрылі сезон на *стадыёне* «Трактар» — аўтамоташоу *Патрыка* Борні. Паралельна планавалі сезон 2007—2008. Увесь час працавалі, нягледзячы на цяжкасці з ліквідацыяй кампаніі і стварэннем новай. Шульман сёння лічыць, што сезон 2007—2008 быў самы няўдачны і нерэнтабельны, аднак тады ён спадзяваўся на лепшае і спрабаваў паставіць кампанію на ногі. Менавіта ў той час камусьці магло падацца, што Шульман не можа плаціць па рахунках, аднак прадзюсар кажа, што шчыра стараўся выправіць сітуацыю.

У 2008 годзе пасля серыі няўдалых канцэртаў кампанія Шульмана зноў пачынае працэс ліквідацыі. З прычыны ўсё таго ж указа прэзідэнта «Клас-Клуб Інтэртэймэнт» ледзь выплаціў ПДВ у бюджэт, але на тое, каб разлічыцца з Лядовым палацам, гатэлем «Мінск» і іншымі юрыдычнымі асобамі, з якімі давялося сустрэцца ў судзе, грошай не хапіла.

Але Шульман і тады не згубіў аптымізму. Неўзабаве яго дбаннямі ўзнікла Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Клас-Клуб Джаз Крафт». Гэтая кампанія існуе да сёння. Праўда, яе дырэктар пакуль сядзіць у турме.

## Версія Шульмана

Указ прэзідэнта, «незаваяваная» Масква, шэраг няўдалых канцэртаў — усё гэта трохі тлумачыць матэрыяльны стан фірмы Шульмана. Але як разабрацца ў прыватных сяброўскіх пазыках?

Генадзь у судзе прызнаўся, што ён сапраўды пазычаў грошы ў знаёмых і ніколі гэтага не аспрэчваў. Праўда, пераконвае, што грошы ён браў пад працэнты і спраўна плаціў 4% у месяц. Толькі летам 2007-га, калі бізнэс разладзіўся, папрасіў працэнты спыніць і асноўныя пазыкі паабяцаў паступова вярнуць.

Генадзь настойвае, што пацярпеламу Аляксандру Кангалёву ён вярнуў пазыку і ўсё працэнты. Распіску забіраць і не падумаў нават. Хто ж ведаў, абураецца Шульман, што сябар-эканаміст пойдзе з паперчынай хлусіць у суд?

У выпадку з Анатолем Чашэвічам версія Шульмана таксама розніцца. Абвінавачаны прызнае, што насамрэч быў вінен «Рыэлці» за арэнду. «Аднак, калі Чашэвіч нерваваўся і прасіў выплаціць тыя грошы, я напісаў яму распіску, нібы не фірма, а я сам вінен гэтыя 32 мільёны». А Чашэвіч, паводле Шульмана, прад'явіў у суд і дакументацыю па арэндзе, і тую распіску: «Вось і выйшла, нібы я вінен два разы гэтую суму». Тыя грошы Чашэвіч ужо спаганяў з Шульмана ў Гаспадарчым судзе. І суд стаў на бок пацярпелага. Пастанова суда ёсць, але сума яшчэ не сплачаная.

Яшчэ цікавейшая гісторыя з астатнімі пацярпелымі. Па словах Шульмана, апроч Кангалёва, яму пазычаў грошы толькі яго сябар Леанід Шпілько. Яму ж выплачваліся і працэнты. Аднак, як толькі шоу-бізнэсмэн перастаў плаціць абяцанае спраўна, Шпілько прывёў сваіх сяброў і сказаў: «Гэта ты не толькі мне вінен, гэта былі іх грошы».

Некаторых сяброў Шпілько Шульман і не ведаў нават. Аднак, як чалавек сумленны, вымушаны быў напісаць усім распіскі і пасяпшацца з выплатай. Пры гэтым Шпілько, паводле словаў шоу-бізнэсмэна, угаворваў не плаціць адразу ўсім патроху, а вяртаць вялікімі сумамі кожнаму з крэдытораў па чарзе. Ён жа сябар, маўляў, ён усіх супакоіць. І першай была Вольга Радкевіч, блізкая сяброўка Шпілько, якой Шульман выплаціў пазыку. Астатнім не паспеў, бо апынуся ў турме.

— Генадзь Міхайлавіч, ці адмаўляліся вы калі-небудзь ад грошай? — спытаў суддзя.

Шульман трохі задумаўся:

— Ведаеце, адмаўляўся. Мне муж Агурбаш прапаноўваў мільён даляраў, каб я стаў яе прадзюсарам. І я адмовіўся. Не ведаю, на жаль ці на шчасце...

## Як габрэй скінхэда пабіў

Плюс да ўсяго, у справе Шульмана прысутнічае абвінавачанне ў «хуліганстве, якое здзейсніла група асоб». Як гэта справа за 2002 год, якая тады была і зачыненая, трапіла ў агульны кацёл — невытлумачальна. Таксама цяжка ўявіць, якія новыя звесткі можа мець следства праз восем гадоў. Паводле словаў адвакаткі, паказанні пацярпелага за 2002 і 2009 гады кардынальна розняцца. Але дайсці да праўды цяжка, бо пацярпелы пакуль не з'яўляецца ў суд, нягледзячы на дзясятак позваў. Шульман ужо даў паказанні, як ён памятае падзеі мінулага.

У 2002 годзе Шульману патэлефанаваў сын і расказаў, што яго, вучня габрэйскай школы, пабілі сем скінхэдаў. Бацька прыехаў да школы, падышоў да аднаго з «брытагаловых», пару разоў патрос і адпусціў. Падлетак «паваліўся і ўдарыўся галавой аб дрэва». Шульман кажа, што быў моцна злы, не добра разумеў, што рабіў, але добра памятае, як было. Ніякіх шасці ўдараў нагамі, рукамі і тварам аб зямлю не было, тым больш не было пагрозаў заціснуць пальцы багажнікам машыны. Усё напісанае ў заяве пацярпелага ў 2009-м — выдумка і не адпавядае рэчаіснасці васьмігадовай даўніны, сцвярджае Шульман.

Суд пакуль не скончаны, шоу працягваецца, наступны этап — апытанне сведкаў. Пакуль былы шоу-бізнэсмэн №1 сядзіць на Валадарцы, высокі суд мусіць вырашыць галаваломку з трох крымінальных артыкулаў, сямі крэдытораў-сяброў, шэрагу неаплачаных пазыкаў і адной старой хуліганкі.

**Генадзь Шульман**

Нар. у 1960. Вучыўся ў ПТУ №8 пры Мінскім механічным заводзе, працаваў на заводзе, адслужыў у войску. У 1983 паступіў у Інстытут культуры. З 1987 займаецца арганізацыяй гастрольна-канцэртнай дзейнасці. У 1992 стварыў ААТ «Клас Клуб ДК» і працаваў з замежнымі канцэртнымі агенцтвамі па ўключэнні Беларусі ў гастрольныя графікі сусветных зорак. Сярод зорак, якія прыехалі ў Беларусь, дзякуючы працы кампаніі, значацца Deep Purple, Scorpions, Nazareth, Роберт Плант, Патрысія Каас і Крыс дэ Бург.

## «Па бульбашу трэба біць інфармацыяй»

**Па словах аднаго з арганізатараў Дня Волі Віктара Івашкевіча, 25 сакавіка чакаецца не менш за 2000 чалавек.** Складаецца ўражанне, што Дзень Волі становіцца нейкім клубам па інтарэсах.

Клічам «Свабода палітвязням» і «Беларусь у Еўропу» працоўнага з «Белвара», настаўніка, лекара, тым больш дзяржслужбоўцу не зачэпіш. 99% грамадства абыякавае да судоў над дзеячамі апазіцыі, таму ў ланцуг неабыякавых людзей становяцца дзясяткі, а не тысячы.

Прапаную змяніць тэматыку заклікаў, транспарантаў, лістовак. Па бульбашу трэба біць інфармацыяй, як БТ з АНТ, толькі супрацьлеглай. Стан заробкаў, умовы працы, жыццё ў суседзяў, беззаконне і некаральнасць чыноўнікаў. Напісаць вялікімі літарамі на плакатах аб надзённых праблемах. Выкласці на паперках і раздаваць канкрэтныя прапановы па паляпшэнні жыцця. І калі адзін з дзесяці праходзячых побач з акцый задумаецца, а адзін са ста далучыцца, гэта будзе добры вынік.

**Спадар Васіль, Мінскі раён**

## Бздура ў касцёле

**Нядаўна ў парафію Святой Тройцы ў Глыбокім даслалі дзеля рэкламы асобнік каталіцкага спеўніка, выдадзенага пяцітысячным накладам івейскімі ксяндзамі.** Надрукаваны ён па-польску расійскай кірыліцай (!).

У Беларусі, асабліва на Гродзеншчыне, шмат каталікоў, якія лічаць сябе палякамі і хочуць маліцца па-польску. Аднак, калі чалавек лічыць сябе палякам, дык мусіць ведаць польскую мову. І таму пісаць для палякаў польскія тэксты кірыліцай — абсурд. Значыць, спеўнік выдаваўся для тых вернікаў, якія польскую мову ўжо забыліся і не хочуць ведаць. А якая карысць для рэлігійнага жыцця асобы ад таго, што чалавека вымушаюць маліцца на мове, на якой ён нават чытаць не ўмее?..

**Кастусь Шыталь, Глыбокае**

## «Рускі» і «расійскі»

Як проста можна змяніць акцэнты недакладным перакладам! Прывяду прыклад. Старажытнабеларуская дзяржава называлася Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае. Няможна ставіць знак роўнасці паміж «расійскі» і «рускі», як няможна пісаць: «Вялікае княства Літоўскае, Расійскае і Жамойцкае».

**Уладзімір Кірыенка, Мінск**

**Ад Рэдакцыі.** «НН» унікае выкарыстання слова «рускі» ў значэнні «расійскі». На добрай беларускай мове «рускае» — гэта якраз тое, што мае дачыненне да праваслаўных земляў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, Русі, Кіеўскай Русі. Ніколі раней беларусы не называлі б жыхароў Масковіі, Расіі «рускімі». Толькі ў XX ст. разам з каланізацыяй свядомасці прыйшло такое называнне. Дарэчы, і па- украінску, і папольску тая самая розніца між «расійскім» і «рускім». Змешваць гэтыя панняці — тое самае што аддаць суседзям сваю спадчыну.

## Дзяржаўнай мусіць быць толькі беларуская

**У Беларусі ўсцяж ідзе дамаганне, каб мова наша беларуская ўсталявалася ва ўсіх дзяржаўных установах Беларусі.** Нас гадамі турбуюць-бударажаць неспрыяльныя ўмовы для развіцця беларускай мовы. Ставіць мову ў спаборніцтва з расійскай — гэта абсурд. На тэрыторыі праз доўгія гады расійская мова дамінавала ад царызму праз камунізм, гэта была русіфікацыя беларусаў. Рэспубліка Беларусь мусіць мець дзяржаўную мову беларускую і толькі, без ніякіх ваганняў і выдумлянняў.

**Кастусь Верабей, Фармінгдэйл (ЗША)**

### ВОДГУКІ

## Змагаюся даступнымі мне сродкамі

**Шчыры дзякуй за «Нашу Ніву» з маімі партрэтамі на марафонах. Такая прыемная нечаканасць!** З 2001 года не езджу на мітынгі. І ўвогуле нікуды не езджу адзін. Зусім кепска бачу... На марафоны мяне вязуць сябры, у Мінск — жонка.

Але змагаюся супраць дыктатуры даступнымі мне сродкамі: чатыры гады бегаў у бел-чырвона-белым касцюме. А заадно прапагандую бег як самую даступную (ва ўсіх адносінах) фізкультуру.

**Андрэй Караленка, Жодзіна**

## Русапяты

**Гурт «The Toobes» — звычайныя русапяты.** Так у 20-я гады мінулага стагоддзя называлі этнічных беларусаў, якія адмовіліся ад сваіх нацыянальных каранёў і выступалі абаронцамі інтарэсаў Расіі.

**Т.Шаклач, Мінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

### ФЕЛЬЕТОН

## Ліст паляка ў беларускаю газету

Гэты ліст аўтар спецыяльна напісаў для дзяржаўнага выдання і накіраваў яго па адрасе: «Першая беларуская газета». Што ён меў на ўвазе, на пошце доўга разбірацца не сталі, і ліст акурат трапіў у першую беларускую газету «Наша Ніва».

«Добры дзень, паважаная рэдакцыя! Піша вам просты паляк з-пад Нёмана. Хачу выказаць сваё абурэнне спробамі асобных дзеячаў уцягнуць членаў нашага саюза ў палітычныя разборкі. Я таксама адразу знаўся з недзяржаўным СПБ, але добра, што спаткаў мяне старшыня калгаса і папярэдзіў:

— Прыйшоў час зрабіць правільныя высновы!

— У сэнсе? — пытаюся я.

— Калі не падтрымаеш афіцыйны Саюз палякаў — каня сеяцца не дам. Будзе табе соткі Анжаліка Борыс араць.

А вясна ідзе. Сядзіба ў мяне з гектар, спадарыня Анжаліка без каня нічога не здолее. Я і кажу:

— Зразумеў, падтрымаю!

Старшыня тады пахваліў мяне за правільны выбар і кажа:

— У Беларусі створаны ўсе ўмовы для развіцця нацыянальных меншасцяў. Спробы падзяліць на «сваіх» і «чужых» адразу наканаваныя на правал.

Які разумны чалавек! Гэта ж калі на самым нізе ў начальніках ходзяць такія мудрыя людзі, нават уявіць сабе страшна, хто ж там наверсе сядзіць.

А Дом той палякам адным і нязручна займаць. Мне старшыня падказаў, і я за тое, каб там БРСМ яшчэ пасялілі і таварыства «Веды». Гэта ўсё дзеля нас, палякаў, робіцца.

**P.S.** Старшыня казаў, што за гэты ліст я атрымаю тэлевізар «Гарызонт», дык, можа, я яшчэ куды напішу, хай мне лепей «Філіпс» дадуць».

**Чытаў Vincent Žuraŭski, Гродна**

### САТЫРА

## Парад

Гонарам я перапоўнены зранку,
Маці мяне падняла на світанку,
Зялёная стужка і гальштук чырвоны,
У люстэрка сябе не пазнаў — эх, прыгожы!

Мой старшы таварыш з БРСМ
Далонь мне працягне і скажа «хадзем».
На сцяг наш прыгожы чырвона-зялёны
Мы разам з ім будзем глядзець улюбёна.

І за дзяцінства шчаслівае наша,
За незалежнасць, за хлеб і за кашу
Мы шчыра падзякуем нашаму Пану,
Які вельмі шчыра і самааддана
Працуе штодзень са святою нагодай
Усё для цябе, для мяне, для народа.

Гады пралятуць, і надыдзе мой час,
Пайду працаваць у сапраўдны калгас!
Каб выканаць план пяцігодкі за год!
Квітней і жыві, Беларускі народ!

**Сяргей Цвяткоў, Мінск**




# Як хакеіст хакеісту

Канькі ў маім дзяцінстве каштавалі 30 рублёў, клюшка — 6 рублёў. Гэта пры заробках у дарослых 100—200 рублёў. А што цяпер? Канькі каштуюць мінімум 150 тысяч, клюшка — 30 тысяч, пры сярэдніх заробках 400—500 тысяч. Піша **Андрэй Юркоў**.

Упершыню на канькі я стаў гадоў у пяць. А з сямі гадоў і па сёння (ужо амаль 30 год) з задавальненнем гуляю ў хакей. Гульня гэта хуткая і бавая. На свежым паветры нават у 15 — 20-градусны мароз дае добрую нагрузку і загартоўку. У дадатак да гэтага вельмі добра здымае стрэсы, бо на вялікай хуткасці працуюць адны інстынкты і цяжар штодзённых праблем адступае.

З дзяцінства люблю сачыць за хакейнымі баталіямі і заўсёды радасна ўспрымаю поспехі, з разуменнем стаўлюся да паразаў. Узгадваю, як у савецкія часы захапляўся гульнёй Фяцісава, Харламава, Крутава. Яны былі для нас, падлеткаў, сапраўднымі героямі.

З той пары прайшло багата часу. Хакей цяпер у нас называюць спортам №1, бо гэта ўлюбёная гульня кіраўніцтва нашай дзяржавы апошнія 15 гадоў. Вось і днямі адбылася нарада высокіх спартовых чыноўнікаў на чале з кіраўніком Беларусі па хакейным пытанні. Галоўнае, што абмяркоўвалася, — гэта «правал» (?!) нашай алімпійскай зборнай па хакеі на гульнях у Ванкуверы. Была зроблена выснова, што кепска працавалі ўсе: і трэнеры, і чыноўнікі, і хакеісты. Кіраўнік дзяржавы загадаў разабрацца і стварыць нейкую «хакейную вертыкаль», каб у будучыні на ўсіх турнірах Беларусь хакейная грымела.

Безумоўна, шмат на нарадзе было і плённых думак, але агульны фон (хакей — для перамог) быў нязменным. Дык у нас, у Беларусі, хакей для народа ці народ для хакея?

Для гульні ў хакей патрэбны хаця б тры рэчы: лёд, канькі і клюшка з шайбай. Зімы ў нас бываюць розныя, але пры жаданні гуляць 1,5—2 месяцы на год можна. Канькі ў маім дзяцінстве каштавалі 20—30 рублёў за пару, клюшка — 5—6 рублёў. Гэта пры заробках у дарослых 100—200 рублёў. Таму набыць хакейныя прылады для дзяцей праблемай не было. Амаль на кожнай вуліцы ці раёне горада альбо вёскі была свая каманда, і гульні па выходных з удзелам 5—6 камандаў «на высадку» былі справай звычайнай.

А што цяпер? Канькі каштуюць мінімум 150—300 тысяч, клюшка — 30—60 тысяч, пры сярэдніх заробках 400—500 тысяч. А клюшак тых трэба 3—4 на сезон.

Вось і выходзіць, што сёння ў Горках сабраць хоць дзясятак чалавек на гульню нерэальна.

Тым падлеткам, каму пашэнціла трапіць у хакейную секцыю (а такіх усяго 15—20 на ўсе Горкі), яшчэ канькі і клюшкі выдаюць. Ды часта гуляць тымі клюшкамі дзеці баяцца, бо трэнеры ім кажуць: калі зломіш, дык новую будзеш набываць сам. Таму і таўчэцца каля хакейнай пляцоўкі так багата моладзі з панурымі тварамі. На прапанову: «Гайда з намі шайбу ганяць», з сумам адказваюць: «І радыя б, ды няма за што набыць ні клюшак, ні канькоў».

А зараз няма ўжо і лёду. Пару тыдняў адлігі ў лютым пазбавілі апошняга энтузіязму нашых тутэйшых спартовых чыноўнікаў, і на пытанні моладзі: калі будзе лёд, маразы ж пякуць — чуем адзін адказ: сезон скончыўся!

Складаецца ўражанне, што нашым «спартыўным функцыянерам» было б лепей, каб той сезон і не распачынаўся. Хакей жа можна паглядзець і па тэлевізары.

Яшчэ разважаюць некаторыя пра лядовы палац у Горках. Маўляў, пабудуюць яго, во тады будзе хакей. Але ж ці праўда гэта? Ну, пабудаваць можа яшчэ грошы і дадуць з Мінска ці Магілёва, але ўтрымліваць той палац давядзецца з раённага бюджэту. Ці пацягнем? Калі мы ў такую зіму, як сёлета, не ў стане знайсці сродкі на чыстку снегу, ваду і канькі з клюшкамі, дык адкуль грошы возьмуцца на падтрыманне ў працоўным стане палаца?

Не болей чым 20—25 чалавек сёння ў Горках рэгулярна гуляюць у хакей, дык што, для іх будзем рабіць гэты палац? А мо лепей давайце спачатку давядзём колькасць хакеістаў у раёне хаця б да 250—300 чалавек, зацікавім людзей займацца масавымі зімовымі відамі спорту. Пачнём заліваць не адзін каток на раён на 50 000 насельніцтва (!), а хаця б 5—10 каткоў. Нават праблему цёплых зімаў можна вырашыць, як у Мінску: усталёўваецца на вуліцы дадатковае ахалоджванне лёду, і катацца можна ад лістапада да красавіка. І танней за палац у разы.

І апошняе. Крыкі чыноўнікаў аб неабходнасці перамог над Канадай і ЗША выклікаюць смех. Бо там хакей — гэта бізнэс, які прыносіць мільярды. Але ён прыносіць іх таму, што там багата жыве народ і мае шмат грошай, каб плаціць за дарагія відовішчы. Квіткі на хакей на Захадзе каштуюць 50—100$, і трыбуны заўсёды поўныя. Там у школах ёсць басейны, залы для спорту і зімовыя лядовыя пляцоўкі. У нас і за 5—10 тысяч ніхто амаль не ходзіць на матчы. А мара нашага кіраўніка аб перамогах у хакеі над «буржуямі» хіба што можа задаволіць яго нязд зейсненыя амбіцыі аб пабудове развітай дзяржавы. Маўляў, глядзіце! Мы хоць і голыя, а вас б'ём.

Таму і выходзіць, што перамогі на сусветных гульнях патрэбныя ў нас перш за ўсё першаму хакеісту краіны. Мне ж, простаму беларускаму хакеісту, патрэбна, каб я, мае дзеткі, суседзі, сябры — усе мы, паважаныя землякі, мелі сродкі і магчымасці займацца спортам, мацаваць здароўе, каб не пілі. А пасля гэтага з'явяцца і нашы сапраўдныя перамогі.

*Горкі*

# У адны вароты

У красавіку ў Бабруйску пройдзе юнацкі чэмпіянат па хакеі, а гэта значыць, што жыхароў горада ўжо накрыла чарговая хваля выцягвання грошай.

Ад бабруйчукоў патрабуюць стварыць запаўняльнасць «Бабруйск-Арэны», мясцовага лядовага палаца, дзе і маюць адбыцца спаборніцтвы.

Прычым улады не асабліва цікавіць, прыйдуць людзі ў палац ці не. Галоўнае, каб кожнае месца акупілася. Змяшчае ж мясцовая славутасць сем тысяч чалавек за раз, гульні ж адным днём, вядома, не скончацца.

Перадусім пад раздачу трапілі бюджэтнікі, медыкі ды настаўнікі. Калі першым трэба набыць некалькі квіткоў на аддзяленне, і такім чынам яны могуць скласціся, дык з апошнімі сітуацыя больш складаная. Настаўнікі мусяць прадаць квіткі навучэнцам, інакш — плаці са сваёй кішэні за ўсе квіткі, што засталіся. І гэта пры тым, што і настаўнікі, і медыкі і так павінны падпісвацца на ведамасную прэсу, якая сама сябе акупіць не здольная.

Як гаварылася вышэй, гэты выпадак не першы. Усё пачалося, калі лядовы палац яшчэ толькі пачынаў будавацца. Тады людзі давалі грошы на яго стварэнне, пазней — на яго працу.

Найбольшага размаху абсурд з выцягваннем грошай набыў роўна год таму, калі ў Бабруйск прыязджаў расійскі гурт «Звери». Квіткі на канцэрт каштавалі ад 25 да 50 тысяч рублёў, і, безумоўна, ахвотнікаў дастаткова не назбіралася. Таму было вырашана людзей «запрасіць». Але тыя бабруйчукі, якія прызвычаіліся да іншае музыкі, набыўшы квіткі, альбо не пайшлі на канцэрт, альбо адседзелі колькі песняў і сышлі.

Як казаў калісьці славуты каментатар Мікалай Озераў, «такі хакей нам непатрэбны». І справа тут не ў гэтай цудоўнай гульні і не ў музыцы гурта «Звери», і нават не ў палацы. Справа ў галовах і ў стаўленні да іншых людзей.

**Максімка Г., Бабруйск**




**«Белорусь» праз «о». Непісьменнасць на праязных квітках Беларускай чыгункі. Станцыя Беларусь — гэта традыцыйная назва прыпынку ў Заслаўі Мінскага раёна.**

# У дзень смерці Кастуся Тарасава ў яго нарадзіўся ўнук

Працяг са старонкі 1.

«Мы яшчэ смяяліся, што ў кагосьці кватэра, а ў Кастуся цэлая рэспубліка, — працягвае Сяргей Кручкоў. — Пашпарт ён рабіў у Расіі, а дакладнага месца прапіскі не меў, бо кватэру ўласную на той момант ужо прадаў».

У Расіі Тарасаў быў на рэабілітацыі пасля інсульту, там ён наноў вучыўся гаварыць.

«Увесь час выбачаўся, што навучыўся гаварыць толькі парасейску. Па-беларуску добра пісаў, а гаварыць было складана пасля інсульту.

Яго смерць надзвычай добра паказвае, якім ён быў чалавекам. Кастусь быў сціплым, нікога не хацеў абцяжарваць, — кажа Кручкоў. — Памятаю, як мы на ТБМ прапаноўвалі яму адзначыць 60-годдзе. Кастусь прасіў: не трэба, не арганізоўвайце, я не прыду. Думалі, што гэта сарамлівае, усё адно імпрэзу арганізавалі. А ён насамрэч не прыйшоў, хаця была замоўлена зала ў кінатэатры «Змена», і людзі сабраліся.

Жыў Кастусь Тарасаў надзвычай сціпла. Уся пенсія сыходзіла на аплату кватэры. Усё, што зарабляў, выдаткоўваў на ежу. І падарункаў не браў. Таму кожны з нас прыдумляў нейкую нагоду для таго, каб перадаць што-небудзь. Алесь Дудараў перадаваў яму па 100 тысяч штомесяц, нібы за нейкую п'есу. Думаю, і не было той п'есы, але Кастусь Тарасаў ні падарункаў, ні грошай не ўзяў бы. Усе мы гэта ведалі.

Кастусь Тарасаў гэтым летам збіраўся да дачкі і ўнучкі паехаць ў Эстонію. Шкада, не дажыў».

Як паведаміў старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч, дзень развітання з Кастусём Тарасавым пакуль не вызначаны, бо гэта залежыць ад прыезду ў Мінск дачкі пісьменніка Ганны Тарасавай. У яе 22 сакавіка ў Таліне нарадзіўся сын.

**Наста Шамрэй**

**Кастусь Тарасаў**

нар. 10 кастрычніка 1940 у Мінску ў сям'і служачых. Пасля школы працаваў слесарам-зборшчыкам на Мінскім механічным заводзе. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1965), працаваў у Паўночна-заходняй геалагічнай экспедыцыі. Потым у выдавецтве «Вышэйшая школа», на кінастудыі «Беларусьфільм», часопісе «Нёман» (1977—1983), газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Спадчына», газеце «Свабода». Апошнія месяцы друкаваў гістарычныя нарысы ў «Новым часе».

Друкаваўся ад 1966. Аўтар гістарычных аповесцей «Дзень рассеяння» (пра Грунвальдскую бітву, 1980), «Пагоня на Грунвальд», рамана «Тры жыцці княгіні Рагнеды». Аўтар культавага зборніка «Памяць пра легенды» (першае выданне ў 1984, другое пашыранае ў 1990).

## Вяртанне да памяці

Адна ластаўка вясны не робіць. Толькі з кніг карактэвічавага паслядоўніка, Кастуся Тарасава, пачалося выхаванне масавага чытача, а не толькі культурных эліт. Менавіта ад яго пачалося перайначванне гістарычнага кода тагачасных беларусаў, іх вяртанне да памяці. Пасля «Пагоні на Грунвальд» (1986) уздагон беларускім сынам паляціць цэлы атрад вершнікаў, каб біць іх у сэрцы мячамі, не даваць быць чужынцамі: гістарычныя выданні Ермаловіча, газета «Свабода», кнігі Арлова.

Тарасаў не падобны да Караткевіча. Нястрыманай рамантызацыі і міфалагізацыі мінулага ён супрацьпастаўляў ураўнаважаны, але дасціпны аповед, які раз-пораз, дзякуючы чарам апавядальніка,ператвараўся ў гістарычны рэпартаж з месцаў падзеяў. Чытаючы «Пагоню на Грунвальд», дзе апісваюцца падзеі 600-гадовай даўніны і ў прыватнасці ўнутраны свет князя Вітаўта, хацелася выгукнуць: "Адкуль Тарасаў усё гэта ведае?!» Не верыць Тарасаву было немагчыма.

Яго «Памяць пра легенды« (1984 па-расійску, 1990 па-беларуску) — багата ілюстраваная кніга пра выбітных дзеячаў, пачынаючы ад Буднага да Каліноўскага, была выдадзеная яшчэ за савецкім часам шматтысячным накладам. Там усё было да месца: узрушаны, але не напышлівы тон, незнаныя раней факты, і вядома, вобраз краіны, гісторыі якой, як высвятлялася, не было чаго саромецца.

Зерне, кінутае Тарасавым у часам такую неўрадлівую беларускую глебу, узышло і красуе. Кнігі Тарасава засталіся прачытанымі.

**Павал Касцюкевіч**

### СПАЧУВАННІ ПРАЗ NN.BY

Добры, пранікнёны быў чалавек. Таленавіты пісьменнік. Добра ведаў стары Мінск. Руплівы рэдактар і ўважлівы да аўтараў. Дзякуючы яму, я апублікаваў у «Спадчыне» ў 1994 г. свой першы навуковы артыкул. А праз некалькі нумароў у часопісе выйшла, толькі дзякуючы яму, на пяцьдзесят старонак вельмі значная для мяне публікацыя «Беларуская справа падчас польскае акупацыі 1919—1920 гг.». Нізкі паклон і мая ўдзячнасць гэтаму чалавеку. Няхай зямля яму будзе пухам.

**Уладзімір Ляхоўскі**

Вечная памяць! Я, сярод многіх іншых, набліжаўся да беларускай гісторыі раней за ўсё паводле кніжак Кастуся Тарасава. Веру: прыйдзе час іх экранізацыі.

**Лявон Баршчэўскі**

Жыў любоўю да родных. Спачуванні Ганне і усім сваякам.

**Алена і Віталь Тарас**

Таксама, як і ўсе тут, пачынаў сваё знаёмства з беларускай гісторыяй з кніжак Тарасава. Дзякуй Вам, спадар Кастусь.

**Андрэй Вашкевіч**

Вялікая страта. Дай яму, Божа, спакою на небе і вечнай памяці на беларускай зямлі.

**Якуб Лапатка**

Спачуванні сваякам і блізкім людзям гэтага вялікага чалавека. Вельмі шкада, што ён не паспеў пабачыць перавыдання кнігі «Пагоня на Грунвальд», якую паспеў дапрацаваць і аддаць рукапіс у працу... Кніга выйдзе ў гэтым годзе і будзе прысвячэннем спадару Кастусю.

**Алесь Квіткевіч**

Гэтая сапраўдная Еўрапейская сучасная літаратура зрабіла з безлічы савецкіх людзей раззамбаваных вольных патомкаў вялікіх князёў, князёўнаў, абудзіла ў нас нашчадкаў спрадвечнай цывілізацыйнай спадчыны нашае краіны. Творы Тарасава стваралі сучаснае Адраджэнне нацыі ад савецкай летаргічнай хваробы. Тарасаў — з'ява гістарычная для краіны.

**Вольга**

### СЦІСЛА

#### «Будзьма» прапануе вызначыць 12 імёнаў Беларусі

Сайт «Будзьма разам!» распачаў акцыю «Імёны Беларусі: топ-12». На сайт budzma.org можна дасылаць свае прапановы. Шляхам галасавання абяруць 12 чалавек.

#### У «Набука» Опера выкарыстала найноўшыя тэхналогіі

19 сакавіка ў Оперы адбылася прэм'ера «Набука» Джузэпэ Вердзі. Гэта першая супольная праца тэатра і расійскага рэжысёра Міхаіла Панджавідзэ (Вялікі тэатр Расіі). Стваральнікі оперы ставілі задачу сродкамі сучаснай машынэрыі, відэапраекцыі наблізіць твор да маладога гледача.

#### «Тры плюс два» вязе на «Еўрабачанне» песню пра матылькоў

Беларускі гурт «Тры плюс два» памяняў песню, з якой выступіць на «Еўрабачанні» ў Осла (Нарвегія). Гурт выйдзе з кампазіцыяй Butterflies («Матылькі»). Музыку да яе напісаў расійскі прадзюсэр Максім Фадзееў, словы — польская паэтка Малька Чаплін.

#### Гісторык Уладзімір Ляхоўскі атрымаў прэмію імя Сапегі

Узнагароджванне пройдзе 8 красавіка ў Варшаве. Прэмія ўручаецца выбітным гісторыкам. Узнагарода дае магчымасць цягам года праводзіць навуковыя даследаванні ў архівах Польшчы.



ФОТО.BYMEDIA.NET

**Уцякай, мароз-дзядуля! Ідзі зіма да кучара, бо ты ўжо надакучыла! Ідзі, зіма, да Кракава, вярнісь да нас аднакава! Ідзі, зіма, да Кіева, каб лета нам пакінула! Гуканне вясны ў Мінску.**

#### Памёр Генрык Гедройц

Брат рэдактара парыжскай «Культуры» Ежы Гедройца Генрык памёр у ноч з суботы на нядзелю ў Мезон-Лафіце недалёка ад Парыжа на 79-м годзе жыцця.

Часопіс «Культура» быў цэнтральным выданнем незалежнай польскай інтэлігенцыі ў часы савецкай акупацыі. У яго асяродку сфармуляваўся базавы прынцып новай польскай замежнай палітыкі: Польшча крэўна зацікаўленая не ў экспансіі на ўсход і падзеле тэрыторый на пару з Расіяй, а ў нацыянальнай незалежнасці Беларусі і Украіны.

Амаль паўстагоддзя — ад 1952 да 2000 г. — Генрык быў найбліжэйшым супрацоўнікам знакамітага брата: адказваў за адміністрацыйны бок, арганізацыю і размеркаванне падпіскі на выданні Інстытута. Гедройцы паходзяць з Мінска. У беларускай сталіцы імем Ежы Гедройца названа вуліца.

**КаМ**

# Краіна атласаў

Наша нацыя шмат чаго мае па два: дзяржаўнае плюс незалежнае. Часам гэта добра. Піша **Алег Дзярновіч**.

За апошні год выйшлі адразу два грунтоўныя і выдатна аформленыя беларускія гістарычныя атласы. Адзін быў зроблены ў дзяржаўным выдавецтве ў Мінску, другі — у недзяржаўным у Варшаве. Аналагаў такім выданням не маюць многія нашы суседзі.

Першы па часе выдання, «Гістарычны атлас Беларусі», рыхтаваўся групай энтузіястаў трынаццаць гадоў. Частка яго стваральнікаў, як піша навуковы рэдактар, расчараваная тэмпамі працы, у свой час ініцыявала працу над «Вялікім гістарычным атласам Беларусі». Трэба разумець, найперш, гэта быў Вячаслаў Насевіч. «Вялікі гістарычны атлас Беларусі» стаў гучным дзяржаўным праектам.

За апошняе дваццацігоддзе гістарычныя геаграфія і картаграфія сталі брэндам беларускай гістарыяграфіі. Пачыналася ўсё з вывучэння не палітычнай, а аграрнай гісторыі — трэба было вызначыць, дзе знаходзіўся той ці іншы маёнтак, як гэтая вёска (мястэчка) называюцца цяпер, у якім павеце ці воласці ВКЛ яны знаходзіліся... Уласную методыку ў гэтых пытаннях яшчэ ў 1970-я пачаў распрацоўваць Міхаіл Спірыдонаў. Яго напрацоўкі знайшлі водгук у абодвух атласах.




**Гістарычны атлас Беларусі. Том І. Беларусь ад старажытных часоў да канца XVIII ст.** / Галоўны навуковы рэдактар М. Спірыдонаў. — Варшава — Мінск: Таварыства «Усходнееўрапейскі дэмакратычны цэнтр» — БГА, 2008. — 164 с.




**Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 3 т.** Т. 1 / Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белкартаграфія»; рэдкалегія: В. Л. Насевіч (галоўны рэдактар) і інш. — Мінск : Белкартаграфія, 2009. — 247 с.

## Панарама «Гістарычнага атласа Беларусі»

Стваральнікі «Гістарычнага атласа Беларусі» заяўляюць, што «імкнуліся паказаць гісторыю Беларусі на шырокім фоне, як неад'емную частку агульнай гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы». І сапраўды, падзеі беларускай гісторыі паказаныя тут у незвычайна шырокай, як для айчыннай картаграфіі, панараме. Тое, што прымоўчвалася ў падручніках, нават універсітэцкіх, на старонках «Гістарычнага атласа Беларусі» набыло картаграфічную рэалізацыю.

Асабліва гэта тычыцца пачаткаў цывілізацыі ў нашым рэгіёне. Калі на шматэтнічным ўграфінска-балцка-сармацка-аланскім славянізаваным грунце ў VIII ст. пад уплывам ваяроў-варагаў узнікае Русь, якая развіваецца са сваёй калыскі на Поўначы, на Ладазе і Белым возеры, уздоўж вялікіх рэк, камунікацыйных шляхоў паміж Скандынавіяй, Візантыяй і арабамі. Пакрысе на землях, якія кантраляваліся хазарамі, развіваецца другая калыска Русі — Кіеў. У той час, калі Русь разрасталася з Поўначы на Поўдзень, шмат што сведчыць пра тое, што ўзнікненне Полацкага княства і яго дынастыі было незалежнае ад кіеўскіх-наўгародскіх Рурыкавічаў. Полацк функцыянаваў незалежна ад Кіева. Паводле беларускай традыцыі, Полацкае княства падаецца ў «Гістарычным атласе Беларусі» як беларуская протадзяржаўнасць.

Відавочна, складальнікаў атласа вельмі хвалявала паходжанне назвы Беларусь. Тут навуковы рэдактар, услед за гісторыкам Алесем Белым, бачыць назву Alba Russia як помнік еўрапейскай схаластыкі позняга сярэднявечча. Назва «Белая Русь» на працягу стагоддзяў не была прывязаная да пэўнага рэгіёна і жыла «самастойным літаратурным жыццём». У Новы час, на думку аўтараў, назва пачала «шукаць» сабе канкрэтны геаграфічны рэгіён. У выніку, назва «Белая Русь» увайшла ў свядомасць русінаў з замежных крыніц праз польскую літаратуру.

У сярэдзіне XVII ст. назва «Беларусь» набывае палітычнае значэнне — маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч пры ўездзе ў Вільню 3 верасня 1655 г. прымае тытул «уладара ўсяе Вялікае, Малой і Белай Русі». У адказ кароль Ян Казімір з ініцыятывы ліцвінаў таксама пачынае пазначаць сябе ў лістах «Вялікім Князем Літоўскім і Белай Русі». У неаўтахтонным, нетутэйшым паходжанні назваў краін у нашым рэгіёне няма нічога ўнікальнага — так, назва «Украіна» паходзіць з польскай, як ускраіны Рэчы Паспалітай, а назва «Расія» ўзнікла ў візантыйскай канцылярыі, бо па правілах грэцкай мовы «у» пераходзіць у «о» (Русь — Расія). Сама ж русь, у чым мала хто цяпер сумняваецца, прыйшла з Скандынавіі.

Сапраўдная новая опцыя атласа — планы беларускіх гарадоў, а таксама сталіцы Рэчы Паспалітай Варшавы. Усё ж, тэрытарыяльная і часавыя адлегласці паўплывалі на пэўныя праблемы атласа з карэктурай. Так, на адной з мапаў Горадня апынулася на рацэ Дняпры, а ў суправаджальным тэксце вялікі князь Аляксандр дазваляе габрэям пасля выгнання ў 1492 г. вярнуцца ў ВКЛ у 1520 г., хоць ужо 14 гадоў парэшткі гаспадара спачывалі ў Вільні.

## Дэтальнасць «Вялікага гістарычнага атласа»

«Вялікі гістарычны атлас Беларусі», выдадзены ў дзяржаўным выдавецтве, паходзіць таксама з картатэкі Міхаіла Спірыдонава. Таму тут такая грунтоўная прапрацоўка рэгіянальных сюжэтаў — прадстаўлены асобныя карты ваяводстваў і паветаў эпохі ВКЛ на беларускіх землях.

Генеральная карта «Беларускія землі ў XVI ст.» на 51 аркушы падае, як заяўляюць складальнікі, усе вядомыя ў той час населеныя пункты, вызначаюцца межы паветаў, валасцей і маёнткаў. Далей ужо, праз карты, можна ісці з павета ў павет. Сапраўднае багацце — гісторыка-геаграфічны паказнік, у якім падаюцца звесткі пра час першай згадкі паселішчаў, іх гістарычныя і сучасныя назвы, адміністратыўна-тэрытарыяльная прыналежнасць на 1567 г.

Аўтары «Вялікага гістарычнага атласа» таксама апелююць да панарамнага бачання гісторыі Беларусі. Раздзел пра старажытны перыяд так і называецца — «Перыферыя антычнай і раннесярэдневяковай цывілізацыі». Апошняе адносіцца да І тыс. н. э., яшчэ да ўзнікнення дзяржаўнасці і Русі. Хоць, у еўрапейскай гістарыяграфічнай традыцыі эпоха Вялікага перасялення народаў таксама ўключаецца ў еўрапейскае Сярэднявечча. Перыферыйнасць можа тут быць, хутчэй, менавіта да рамана-германскага свету, але не да Сярэднявечча ўвогуле. Падобныя фармулёўкі патрабуюць дапрацоўкі.

Але і ў такім выданні не абышлося без дробных недакладнасцяў. Напрыклад, як адзначаюць украінскія рэцэнзенты, на тэрыторыі Украіны першай паловы XVI ст. пазначаны гарады, якія былі знішчаныя ў мангольскую навалу 1240-х гадоў і ўзноўленыя ўжо значна пазней, у канцы XVI — першай палове XVII стст. — Корсунь (Корсунь-Шаўчэнкаўскі), Пераяслаў (Пераяслаў-Залескі), Белая Царква.

Алег Латышонак таксама пісаў пра абмежаванасць звестак у «Вялікім атласе» па Падляшшы. Хрысціянізацыя беларускіх зямель паказана толькі ў межах сённяшняй Рэспублікі Беларусь. На карце «Праваслаўе» на захад ад сучаснай беларуска-польскай мяжы прадстаўлена толькі 11 цэркваў ды Драгічын і Супрасль як месцы, дзе былі манастыры. Тым часам вядомы беластоцкі гісторык праваслаўя Антон Мірановіч налічвае тут каля васьмідзесяці прыходаў, а ў іх каля ста цэркваў і капліцаў, якія існавалі перад 1569 г. Дадамо магдэбургскія гарады і густую сетку паселішчаў — гэта дазваляе зразумець, якой культурна-цывілізацыйнай і дэмаграфічнай стратай для ВКЛ было адлучэнне ў 1569 г. Падляшскага ваяводства.

Тут мы сутыкаемся з метадалагічнай праблемай суадносін сучасных дзяржаўных тэрыторый, замацаваных Хельсінскім актам 1975 г. і даўнімі этнічнымі тэрыторыямі народаў. Як і ў большасці еўрапейскіх народаў, гісторыю беларусаў немагчыма загнаць толькі ў абрысы сённяшніх дзяржаўных межаў. Таму непалітызаваны падыход да гістарычнай картаграфіі прадугледжвае непарушнасць сучасных межаў і адкрытае прадстаўленне ранейшых культурных і этнічных абшараў.

## Варта мець абодва

Варта нагадаць, што ў Беларусі картаграфічная дзейнасць падлягае ліцэнзаванню і амаль манапольныя правы на яе замацаваныя за дзяржаўным прадпрыемствам «Белкартаграфія». Таму, у сэнсе камерцыйным, з'яўленне ў Варшаве беларускага гістарычнага атласа можа ўспрымацца «Белкартаграфіяй» як акт канкурэнцыі. І хваля падобных высвятленняў ужо пракацілася па беларускіх кнігарнях.

Але змястоўна абодва атласы не столькі пярэчаць, колькі дапаўняюць адзін аднаго — праз прапанаваны маштаб падзеяў у «Гістарычным атласе Беларусі» і дэталіроўку сюжэтаў у «Вялікім гістарычным атласе Беларусі». Наяўнасць часткі тых самых імёнаў у аўтарскіх калектывах абодвух атласаў пацвярджае гэтае меркаванне.

Цяпер, шукаючы карты для ілюстравання той ці іншай гістарычнай падзеі, трэба будзе ўлічваць абодва гэтыя атласы.

# Вялікія княгіні і ворагі ВКЛ у адным томе

Выйшаў трэці том энцыклапедыі «Вялікае Княства Літоўскае».

Тут у алфавітным парадку: звесткі аб найбольш значных гістарычных постацях, культурных дзеячах, прававых помніках ВКЛ, якія не патрапілі ў першыя два тамы.

«У том мы таксама ўключылі папулярную цяпер гендэрную тэматыку — імёны і звесткі пра вялікіх княгінь літоўскіх, — кажа адзін з рэдактараў выдання Юрый Бажэнаў. — Не забыліся і пра зацятых ворагаў Княства: на старонках энцыклапедыі — дадзеныя пра ўсіх магістраў Тэўтонскага Ордэна».

Як і папярэднія тамы, гэтае выданне багата ілюстраванае фотаздымкамі, малюнкамі, картамі і планамі. Афармляючы ёмісты том, мастак Зміцер Герасімовіч, трымаўся ранейшага канцэпту: партрэты дзеячаў ВКЛ узятыя выключна старадаўнія, а вось архітэктурныя славутасці прэзентуюцца фотаздымкамі або гравюрамі Напалеона Орды.

Да трэцяга тома энцыклапедыі ёсць немалыя дадаткі: тэксты Крэўскай уніі, Прывілеяў і ўсе тры рэдакцыі прававой асновы сярэднявечнага гаспадарства — Статута ВКЛ.

У стварэнні фундаментальнага даведніка ўдзельнічалі навукоўцы Інстытута гісторыі і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук.

Паўнакроўна кнігу прадставілі ў сталіцы Вялікага Княства. Гэта адбылося пры канцы лютага на Віленскім кніжным кірмашы. На прэзентацыю завітала нават літоўская прэзідэнтка Даля Грыбаўскайце.

«Пакуль рэакцыі з боку літоўскіх спецыялістаў на трэці том мы не маем, — дадае Юрый Бажэнаў. — Але, нягледзячы на адрозныя трактоўкі гісторыі, першыя два тамы літоўцы ацанілі высока. Спадзяемся, што належна ацэняць і трэці».

Наклад энцыклапедыі — 3 тысячы. Кнігу можна набыць за 41 тысячу (цана за ілюстраванае, 694-старонкавае выданне — памяркоўная) ў кнігарні «Энцыклапедыя», завулак Калініна, 16, другі паверх.

**Лявон К.**




**Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя.** Т.3. Дадатак А—Я. — Мінск: «Беларуская энцыклапедыя», 2010.

**Аляксандр Апон.** Сатырычнае апавяданне.

# Мамант


PHOTO.BYMEDIA.NET

Вечарэла. Сяргей Пятровіч, доктар гістарычных навук, член Геральдычнае рады пры прэзідэнце, уехаў у двор свайго дома і прыпаркаваўся на звыклым месцы — якраз насупраць вокнаў сваёй кватэры. Прыціскаючы да сябе тоўсты скураны партфель, подбегам пусціўся ў свой пад'езд.

— Добры вечар, Сяргей Пятровіч, — павіталася з ім суседка, якая сядзела ля пад'езда на лавачцы, старая і дурная як бот кабета. Сяргей Пятровіч любіў часам запытацца ў яе пра тое-сёе, каб быць бліжэй да народа, накшталт: «Ну што, Райка, не разлюбіў наш народ Бацьку?» ці «А што, за Бацьку пойдзем галасаваць, ці ты мо, Райка, у БНФ падалася?» — але на гэты раз не запытаўся нічога. Яму гэтак карцела папасці хутчэй дахаты, што нават не стаў чакаць ліфт, а, нягледзячы на гады і задышку, пусціўся пехатою на пяты паверх. Праўда, у кватэры мусіў прысесці ў передпакоі на крэсла, каб аддыхацца, і толькі затым пазваць жонку:

— Надзя?.. Ты дзе, Надзя?

— Што такое? — выбегла з пакоя Надзя ў хатнім халаце, з акулярамі на носе і кнігай у руцэ.

— Надзя, сенсацыя, ты не паверыш! — усхвалявана прамовіў Сяргей Пятровіч і тыцнуў сябе пальцам у жывот. Я першы, я адкрыў!

— Што першы, што адкрыў? — вырачылася Надзя.

— Зараз усё ўведаеш, — прысеўшы побач яе на канапу, паабяцаў Сяргей Пятровіч і дастаў з партфеля часопіс. — Гэта, Надзя, спецыялізаваны амерыканскі палеанталагічны часопіс. Ён на англійскай мове, прачытаць нічога немагчыма, але малюнкі нічога сабе трапляюцца. Сядзеў я сёння, гартаў сабе паціхеньку, як раптам бачу — здымкі зрэзу біўня мамата. І так нешта мне падалося знаёмым... Прыглядзеўся — аёй! — ажно абамлеў. Але вазьмі, сама паўзірайся.

Надзя ўзяла часопіс.

— Не, нічога не пазнаю...

— А ты прыглядзься! — усклікнуў муж. Надзя зірнула яшчэ раз і пацепала плячыма.

— Ну як жа! — ажно ляпнуў з прыкрасці рукамі Сяргей Пятровіч і пачаў тыцкаць пальцам у малюнак. — А гэта што, га?.. што табе нагадвае?.. ну, ну што?

— Ромбікі нейкія, — не зусім упэўнена адказала Надзя

— Не ромбікі, а рамбічны арнамент! — ажно падскочыў Сяргей Пятровіч.

— І што? — адазвалася Надзя.

— А тое, — не у сілах болей вытрымаць ускочыў ён на ногі і пайшоў па пакоі, — што дакладна такі самы арнамент на нашым сучасным дзяржаўным сцягу! Да якога я, Надзечка, — тут ён спыніўся, — як ты добра ведаеш, — падняў палец угару, — маю самае простае дачыненне!

— Во-о-сь што! — нарэшце дайшло да жонкі.

— Ага! — падцвердзіў Сяргей Пятровіч яе здагадку і, шчасліва засмяяўшыся, працягнуў: — Мяне таксама адразу як бы таўкачом па галаве стукнула — гляджу і вачам не веру. Цяпер, безумоўна, вымалёўваецца зусім іншая карціна, ад якой нашы нацыяналісты заплачуць што бабры. Гэта ім не бела-чырвонымі палосамі нам у нос тыцкаць, папракаць, што ад каранёў адракліся . Не-е! І мы не пальцам робленыя, а ад самых мамантаў выйшлі! Ты ўяўляеш, Надзя, якая гэта сівая даўніна, якая глыбіня! Куды там нават нейкім французам, дый што французам — грэкам!

Сяргей Пятровіч махнуў па-заліхвацку рукой і трохі спакайней, як на лекцыі перад студэнтамі, дадаў:

— Такім чынам, па ўсім бачна, што наш сцяг паходзіць аж з часоў мамантаў і па праву можа лічыцца самым старажытным у свеце.

— Яшчэ як уяўляю! — загарэлася ўслед за Сяргеем Пятровічам Надзя. Яе вочы заблішчалі, і грудзі пад халатам пачалі ўздымацца хутка-хутка. — Але калі гэта нехта і мог адкрыць, дык толькі ты, Сярожа. Я ведала, які ты, калі выходзіла за цябе замуж... Толькі не трэба на гэтым спыняцца, а смела ідзі далей!

— Як? Куды далей? — вылупіўся Сяргей Пятровіч, бо насамрэч было незразумела: перад мамантамі, калі абапірацца на строга навуковыя дадзеныя, ішлі толькі голыя малпы, якія напэўна сцягоў не мелі.

— Ну як жа куды! А прозвішча нашага прэзідэнта не забыўся? Калі ад яго прозвішча адкінуць чатыры апошнія літары, выйдзе што?..

Сяргей Пятровіч пачаў адкідаць літары па адной і, дайшоўшы да пятай, ахнуў. Усё стала на свае месцы: роўная дарога выводзіла прэзідэнта проста ад евангелістӑ.

— А ты ведаеш, Надзя, куды гэта нас з табою можа занесці? — пасля роздуму, прыцішаным ад хвалявання голасам запытаў Сяргей Пятровіч. — Гэта ж сама менеей у акадэмікі!

Ён заплюшчыў вочы і палячэў у неба, адкуль, прысеўшы на воблака, убачыў сябе з зоркай Героя на штрыфлі на сумесным пасяджэнні Акадэміі навук і палаты прадстаўнікоў. І толькі пад дружныя працяглыя апладысменты падняўся на трыбуну, каб сказаць таварышам колькі ўдзячных слоў, як яго спусціла на зямлю Надзя:

— Хадзем, вячэраць час, — сказала яна і пайшла ў кухню.

# Знакі прыпынку

**Уладзімір Някляеў.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

* * *

Я выпісаўся са шпіталя і паехаў на лецішча да Бураўкіна. Адсвяткаваць ягоны 71 дзень нараджэння. Па дарозе згадаў, як святкавалі 70 і як мяне гняло, што ўсе састарэлі. І ён, і Рыгор, і... Карацей, як праз гэта набраўся, і таму нічога болей не помню, апроч таго, як гняло, і як праз гэта набраўся.

Гэтым разам не піў, а Генадзь Мікалаевіч выпіў. Не так, як я мінулым разам, але ўсё ж... І пачаў казаць мне, калі ўжо падняліся з-за стала і на вуліцы шашлыком закусвалі, што ўсё правільна я рабіў, спрабуючы некалі Лукашэнку на наш бок перацягнуць. Удала ці няўдала рабіў — гэта іншая справа, але правільна. Шкада, што не давёў усё да нейкага лагічнага канца. Зноў жа, невядома, да якога...

Думкі такія з'явіліся ў галаве Генадзя Мікалаевіча пасля таго, як Вітаўт Кіпель давёў яму, што зацятая канфрантацыя з уладай — не самае лепшае, а самае горшае з таго, што мы, літаратары, маглі зрабіць і зрабілі на шкоду Беларусі і беларушчыне. Васіль Быкаў, ён, я... Тую ж самую памылку дапусціў перад намі Зянон Пазняк, і гэта стала нібыта ўзорным стылем паводзін апазіцыі, а насамрэч — рамантычнай дуратой. Сапраўдная палітыка — гэта перш за ўсё гнуткая сістэма дамоўленасцяў і кампрамісаў. Такім шляхам чалавецтва і прыйшло да дэмакратыі, якая і ёсць не што іншае, як сістэма кампрамісаў. І калі б мелі мы хоць нейкі палітычны вопыт, нейкую школу дэмакратыі, мы б таксама пайшлі гэтым шляхам. Дамаўляліся б з уладай, каб не ўсё беларускае згубіць, каб нешта змяніць да лепшага.

Прыблізна тое самае (толькі ўжо не пра мяне, а ўвогуле пра нейкую нескарыстаную магчымасць) Бураўкін паўтарыў, калі да нас падышоў Аляксандр Старыкевіч. Той катэгарычна не згадзіўся: «Нічога і ніхто, ні вы і ні Быкаў, не змаглі б зрабіць, каб нешта ў Лукашэнку змянілася. Так што няма пра што шкадаваць».

Бураўкін наліў мне кілішак і сказаў: «А, можа, і правільна цябе за гэта з двух бакоў білі...»

* * *

Дзіўна чытаць паслясавецкаму чалавеку: «Не сам па сабе капіталізм прывядзе да роўнасці людзей і дабрабыту, а мараль, адпаведная расквітнеламу капіталізму».

Здаецца, аўтар пераблытаў словы капіталізм і камунізм, а рэдактар памылку не выправіў.

Але няма памылкі, бо аўтар (іспанец Раміра дэ Маэсту) — капіталіст. Філосаф, які сфармуляваў тэзу: «Укладанне грошай — праблема этычная».

* * *

Пасля перамогі Рыма над Дакіяй (цяперашнія Румынія і Малдова) імператар Траян наладзіў відовішча, якое доўжылася 123 дні. На арэне біліся 10 000 гладыятараў. Было затраўлена 11 000 звяроў.

Баі гладыятараў — гэта кроў. Смерць. Але разам з тым — гэта культура.

Патрэба ў відовішчах сёння не меншая. Нават большая, бо болей хлеба і вольнага часу. І рымляне ідуць глядзець, як «Рома» б'ецца з «Міланам».

Гладыятараў замянілі футбалісты. Нехта можа назваць гэта вынікам развіцця цывілізацыі. Я згодны. Але не развіцця культуры, бо ў баях гладыятараў яе куды болей. Настолькі болей, наколькі ў «баях» футбалістаў яе меней. Настолькі меней, што зусім няма.

* * *

Калі кажуць: «Стары ўжо, пажыў...» — амаль кожнага разу згадваю чамусьці фотаздымак хворага Малевіча ў шпітальным ложку. Ляжыць на крайку падушкі, прыкрыты прасцінай, загорнутай з-пад шыі на коўдру, і барада на прасціне, праз якую ён нагадвае і Дастаеўскага, і Распуціна, і пратапопа Авакума адначасова.

А Малевічу ў 1935-м, калі ён памёр, было ўсяго 57.

Калі памёр, замест абраза над ім павесілі ў надгалоўі «Чорны квадрат». Магчыма, выключна для гэтага (ці з думкай пра гэта) ім і намаляваны.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**АЛЕГ МІНКІН**

СТРАЧАНЫ РАЙ

Я кажу: зжоўклых дрэў пазалота
нагадала мне Страчаны Рай
гэтак востра, што жыць неахвота!
А яна: памірай...

Я кажу: столькі золата й медзі
сыпануў сёння час–скупярдзяй
мне пад ногі, што можна памерці!
А яна: памірай...

Я кажу: без пяшчоты так хутка
змізарнеў гэты свет, што, бадай,
можна ўзвысць і памерці ад смутку!
А яна: памірай...

Я кажу: я адзін тут... дык хто ты,
што ўжо пхнеш мяне за светакрай?
А яна: я — твая Адзінота,
я кажу «памірай»...



# Беларускія танцы

**Шточацвер ад 19-й да 23-й у кавярні «Жар-птушка»** адбываюцца беларускія вечарынкі. Уваход каштуе 6 тыс. рублёў з носа. Зазвычай збіраецца каля 70—80 чалавек. Наведваюць танцы пераважна юнакі і дзяўчаты: студэнты і працоўныя. На танцах вучаць ойру, падэспан, полькі. Большасць наведнікаў — беларускамоўныя. **Кавярня месціцца ў парку Горкага, ля вадаспаду.** Даезд да метро «Плошча Перамогі» ці аўтобусам нумар 100 па праспекце. Або трамваямі да прыпынку «Парк Горкага».

**Фота Юліі Дарашкевіч**







**Шапэн у Філармоніі**

**24 сакавіка ў Вялікай канцэртнай зале Філармоніі (пр.Незалежнасці, 50) а 19-й** пачнецца канцэрт Jazz Chopin у рамках святкавання года Фрыдэрыка Шапэна. Выканаўцы: камерны аркестр Aukso.

## ХАКЕЙ

**«Юнацтва» — «Шахцёр»**

23 сакавіка пачынаецца фінальная серыя першынства Беларусі па хакеі. За золата змагаюцца мінскае «Юнацтва» і салігорскі «Шахцёр». Першыя два матчы адбудуцца **ў сталіцы 23 і 24 сакавіка на крытым катку ў парку імя Горкага. Пачатак сустрэч у 18:30. 27 і 28 сакавіка** каманды пераедуць **у Салігорск. Пачатак тых сустрэч у 13:00.** Калі спатрэбіцца, то астатнія матчы серыі пройдуць **30 сакавіка, 1 і 3 красавіка.** Серыя працягнецца да чатырох перамог адной з каманд. У рэгулярным першынстве экстралігі клубы сустракаліся чатыры разы. Тройчы ў тых матчах перамагалі салігарчане.

## ІМПРЭЗЫ

**«Залаты апостраф»**

Уручэнне літаратурнай прэміі «Залаты апостраф» адбудзецца **25 сакавіка ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул. Багдановіча, 13). Пачатак у 18.30.** Намінантаў на прэмію, якую заснаваў часопіс «Дзеяслоў», выбіралі праз інтэрнэт-галасаванне. У кожнай намінацыі было прадстаўлена па сем аўтараў, што друкаваліся ў часопісе ў 2009 годзе. Зараз прэтэндуюць на атрыманне прэміі пісьменнікі, якія набралі найбольшую колькасць галасоў. У паэзіі гэта Рыгор Барадулін, Уладзімір Арлоў, Валярына Кустава; у прозе — Віктар Казько, Міхась Андрасюк, Дар'я Ліс; у дэбюце — Віталь Быль, Алена Радачынская, Алена Селькіна.

**+1 ГеніюшВерш**

**Кожную нядзелю а 15-й у кнігарніЎгалерэі (пр. Незалежнасці, 37а)** можна пачуць верш Ларысы Геніюш у выкананні аднаго з вядомых паэтаў.

**Адкрыццё Цэнтра імя Каліноўскага ў Аргенціне**

**24 сакавіка а 16-й у горадзе Лавалёл, правінцыя Буэнас-Айрэс, у штаб-кватэры культурнага і спартыўнага клуба «Дняпро» (Дуальдэ, 265)** адчыніцца Беларускі цэнтр імя Кастуся Каліноўскага. Арганізуе яго пасольства Беларусі ў Аргенціне. Цэнтр будзе працаваць **па серадах ад 18 да 21 гадзіны і па суботах ад 10 да 13 гадзін.** Першыя мерапрыемствы: урокі музыкі і традыцыйныя ўрокі спеваў, работы па дрэве, жывапіс, беларуская вышыўка, родная мова, гісторыя і культура Беларусі.

## ВЫСТАВЫ

**Гістарычны музей: экспануецца ўпершыню**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 29 мая** працуе выстава «Экспануецца ўпершыню», якая знаёміць наведнікаў з новымі набыткамі музея.

**Зваротны бок зорак**

Выстава «Зваротны бок зорак» фотамастака Аляксандра Ждановіча (Tarantino) экспануецца **да 25 сакавіка ў кінатэатры «Перамога» (вул. Інтэрнацыянальная, 20).** На выставе прадстаўленыя фотаздымкі гуртоў «Ляпіс Трубяцкі», «Нейра Дзюбель», «Без білета», «The Toobes», «Дзецідзяцей», «Срэбнае вяселле», «Разбітае Сэрца Пацана», «Крамбамбуля» і многія іншыя.

**«Стан» Наталлі Яўмененкі**

**У галерэі «Свет фота» (вул.Прытыцкага, 10а)** працуе фотавыстава Наталлі Яўмененкі «Стан». Перад вамі — своеасаблівы расповед пра ўзаемасувязь месца мадэлі і фатографа.

**Жывапіс Валяр'яны Жоўтак**

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20) да 29 сакавіка** працуе выстава жывапісу Валяр'яны Жоўтак «Кола часу». Мастачка працавала ў розных жанрах, але найбольш вядомыя яе націюрморты.

**Кветкавы баль**

**У Музеі Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а) да 28 сакавіка** працуе выстава фларыста Дзіны Шымук «Кветкавы баль». Дзіна Шымук — першы беларускі фларыст, яна працуе ў тэхніцы ашыбана. Гэта жывапіс раслінамі. Мастак збірае і засушвае кветкі, зёлкі, лісце, а пасля стварае з іх творы.

**Стан розуму**

**Да 30 сакавіка ў галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а)** працуе выстава інсталяцый State of Mind (Стан розуму) Анікі Карлсан Рыксан і Анны Віёлы Хальберг (Швецыя).

## ТЭАТРЫ

**24 сакавіка**

**Тэатр лялек** — «Чаму старэюць людзі?..»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»
**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Тэатр оперы і балета** — «Стварэнне свету»
**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»

**25 сакавіка**

**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Тэатр лялек** — «Чайка. Досвед прачытання»
**Тэатр юнага гледача** — «Апошняя дуэль»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»

**26 сакавіка**

**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладзіна»
**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»
**Тэатр юнага гледача** — «Мешчанін у шляхецтве»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр оперы і балета** — «Лебядзінае возера»

**27 сакавіка**

**Тэатр юнага гледача** — «Дарога на Віфлеем»
**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладзіна»
**Тэатр оперы і балета** — «Вяселле Фігара»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Купалаўскі тэатр** — Тэатральны капуснік
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»

**28 сакавіка**

**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Тэатр оперы і балета** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Квакі і квокі»
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Тэатр оперы і балета** — «Травіята»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»

**29 сакавіка**

**Тэатр юнага гледача** — «Па зяленых гурбах акіяна»
**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Карусель»
**Купалаўскі тэатр** — «ГендэльБах»

**30 сакавіка**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр лялек** — «Халоднае сэрца»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Тэатр оперы і балета** — «Пахіта», «Балеро»
**Купалаўскі тэатр** — «Больш чым дождж»
**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта (Інтымны дзённік)»

**31 сакавіка**

**Тэатр юнага гледача** — «Шытая лялька Рэгедзі Эн»
**Тэатр лялек** — «Піпі Доўгаяпанчоха»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жанчыны Бергмана»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Тэатр оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»

## КІНО

# Чырвоная тыранія ў Залюстроўі

**Alice in Wonderland**

ЗША, 2010, каляровы, 3-D, 108 хв.

**Рэжысёр:** Цім Бёртан

**Ролі выконваюць:** Міа Васікоўская, Джоні Дэп

**Жанр:** Фантасмагарычныя прыгоды паводле аднайменнага твора Льюіса Кэрала

**Адзнака:** 6,5 (з 10)

Амаль дарослая Аліса, уцякаючы ад жаніха, трапляе ў краіну сваіх дзіцячых прыгодаў. У казачнай дзяржаве ўладу захапіла хвороба на ўсю галаву Чырвоная Каралева (а галава ў яе вялікая). Падданыя мараць пазбыцца тыраніі. А для гэтага Аліса мусіць забіць Мармазяўра. Аліса, праўда, не спяшаецца ўсталёўваць дэмакратыю ў Залюстроўі…

Рэжысёра Ціма Бертана ўжо паспелі папракнуць за тое, што ён стварыў саму не-кэралаўскую Алісу за ўсю гісторыю кіно. Сапраўды, абсурдызмы пазнікалі, сюжэт спрошчаны.

Але Бёртан пайшоў па шляху нядаўняга «Шэрлака Холмса» — знаёмыя персанажы дзейнічаюць у цалкам новай гісторыі. Другі піск сезона — візуальныя стэрэафантазіі: чырвоныя і белыя арміі, свінка пад ногі, лісліўыя прыдворныя з накладнымі вушамі, абкураны вусень, а рэцэпт зёлак раю нікому не паўтараць.

Непаўторна іграюць Хелена Бонэм-Картэр (Чырвоная Каралева) і Джоні Дэп (Капялюшнік). Шкада, што за расійскім дубляжом згубіліся галасы Стывена Фрая і Крыстофера Лі (Чашырскі кот і Мармазяўр).

Квіткі на «Алісу» цяжка набыць.

**Андрэй Расінскі**



# Сэксісцкія меркаванні жанчынаў пра мужчын

Жанчыны часта наракаюць на мужчынскі сэксізм, але і самі без усялякіх падставаў мысляць стэрэатыпамі ў дачыненні да мужчын. Напрыклад, такімі:

— мужчына павінен мець правы кіроўцы; калі не мае, гэта не мужчына;

— мужчына заўжды хоча сэксу; калі не хоча, то ён альбо гей, альбо здраджвае;

— мужчына ніколі не стамляецца, ён заўжды павінен мець сілы на спатканне або сэкс; калі не мае, значыць, нешта круціць;

— мужчына павінен добра зарабляць; калі зарабляе кепска, гэта не мужчына;

— мужчына не мае ніякага густу — ён хоча сэксу з любой жанчынай, няважна, важыць яна 200 кілаграмаў ці злая, як бульдог; калі ён не хоча сэксу з любою, ён альбо гей, альбо не мужчына;

— мужчына павінен умець рамантаваць рэчы ў доме, мяняць пракладкі ў кранах і г.д.; калі не ўмее, гэта не мужчына;

— мужчына павінен цікавіцца спортам; калі не цікавіцца, гэта не мужчына;

— мужчына павінен любіць піва; калі не любіць, гэта не мужчына.

Ведаеце яшчэ якія-небудзь?

**КаМ**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Стэрэатып сапраўднага мужчыны ўстаў у часы фемінізму. На фота: Забіт Самедаў, беларускі чэмпіён свету па муай-тай.**

ЗДАРОЎЕ

## Некаторыя вытворцы вады бяруць яе з-пад крана

Пра гэта паведамілі ў аддзеле гідрагеалогіі РУП «Беларускі навукова-даследчы геолагаразведачны інстытут». У 2009 годзе супрацоўнікі інстытута абследавалі дзесяць прадпрыемстваў па вытворчасці бутыляванай вады ў Мінскім раёне.

Высветлілася, што большасць прадпрыемстваў маюць артэзіянскія свідравіны, але сёй-той разлівае ваду з водаправода. Пры гэтым на этыкетцы прадукту ўказана, што вада паступае з артэзіянскіх свідравін.

Санітарныя правілы рэгулююць толькі якасць вады, а не крыніцу яе паходжання. Вада найвышэйшай якасці — гэта фізіялагічна паўнавартасная вада, якая ўтрымлівае біялагічна актыўныя элементы, солі ў тых канцэнтрацыях, якія патрэбны чалавеку па фізіялагічных нормах.

**БелаПАН**

ВЫХАВАННЕ

## У Швейцарыі забаранілі жорсткія відэагульні

Тыя, дзе, каб перамагчы, «трэба чыніць гвалт супраць людзей ці чалавекападобных істотаў».

Швейцарскі парламент прыняў закон, які забараняе віртуальныя гульні, дзе, каб выйграць, трэба забіваць. З прапановай такой забароны выступілі сацыялісты і хрысціянскія дэмакраты. Крытэры забароны яшчэ не прапісаныя, але мяркуецца, што ў чорны спіс трапяць гульні, дзе па сюжэце, каб перамагчы, «трэба чыніць жорсткі гвалт супраць людзей ці чалавекападобных істотаў».

Праўда, калі абураных новым законам геймераў набярэцца 100 тысяч, яны змогуць вынесці пытанне на рэферэндум.

**cz**

ТЭХНАЛОГІІ

## Хочаш не хочаш, а ўсміхнешся

У Германіі стварылі лічбавую камеру, якая прымушае людзей на здымках усміхацца. Фотаапарат пад назвай «Штучная ўсмешка» імітуе ўсмешку на твары любога чалавека. Для апрацоўкі фатаграфіі выкарыстоўваецца база дадзеных са здымкамі людзей, якія ўсміхаюцца. Падабраўшы патрэбную ўсмешку, камера адаптуе яе да зробленага кадра.

**ЯВ**

### Сапраўдная беларуская кухня

## Пірог на Вялікдзень

2 пачкі дражджэй, 1/4 кубка цёплай вады, 1 кубак цёплага малака, 1/2 кубка цукру, 1/2 гарбатнай лыжкі ванілі, 5 кубкаў перасеянай мукі, 1/2 гарбатнай лыжкі солі, 3 яйкі, 1/4 кубка разынак, 1/4 кубка гатовых мігдалаў, 1/3 кубка мяккага масла (туку)

Распусціць дрожджы ў цёплай вадзе. Замясіць усё, акрамя мукі. Тады замяшаць муку, каб можна было цеста добра выбіць. Пакласці на мукой пасыпаную дошку і качаць цеста, аж пакуль не стане мяккае й пругкае. Тады пакласці ў маслам вымазаную міску, накрыць мокрай анучкай і пакінуць на дзве гадзіны. Вызначыць, што цеста гатовае, можна, націснуўшы на яго пальцам. Мусіць застацца ямка. Тады трэба замяшаць і даць ізноў падысці (паўгадзіны). Следам можна рабіць пірог і даць яшчэ падысці 15 хвілін. Пячы, пачынаючы з тэмпературы 205°С, потым меней.

**З кнігі «Вялікалітоўская (беларуская) кухарка», выдала М. Станкевічыха ў Нью-Ёрку (1959), падрыхтавала НБ**

### Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Любы наш сябра Францішак Вячорка!** Віншуем з Днём Волі і днём народзінаў. Шчасця і вольнасці! Сябры з клуба «Спадчына».

**ПАДАРОЖЖЫ**

**Антон Астаповіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа 28 сакавіка па маршруце: Шчучын—Каменка—Дэмбрава—Астрыно—Галавічполле—Гурнофель—Ішчолна—Лядск. Т.: (029) 111–73–32.

**Запрашаем** ў падарожжа: Рым–Ватыкан 19.04.—27.04.2010 (320 еўра). Нягледзячы на тое, што арганізатарам з'яўляецца Рымска–каталіцкі касцёл, пілігрымка разлічана на шырокае кола людзей. Умовы паездкі не прадугледжваюць узроставага абмежавання, а веравызнанне не мае значэння. Суправаджаюць пілігрымку святар і гіды–перакладчыкі. Экскурсіі выключна на беларускай мове. Больш падрабязна на сайце www.piligrymka.by. Т.: (029) 618–72–99, (029) 518–72–27.

**ЗНАЁМСТВЫ**

**Шукаю сяброўку для шлюбавання.** Астатняе — праз СМС–ліставанне альбо размову па тэлефоне. Т.: (033) 683–95–84. Улад, Гомель

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

## Дапаможам Дарцы!

16–гадовай дзяўчынцы з Гомеля трэба неадкладнае лячэнне за мяжой. Дарка Журбіна нарадзілася 26 верасня 1993 г. з дыягназам ДЦП, геміплегія III ст. і сутаргавы сіндром. У апошні час стан Даркі пагоршаў. Штодзённыя сутаргі робяць ёй невыносны боль. За пакутамі дачкі вымушана назіраць мама Даркі, Наталля Журбіна, якая не мае чым дапамагчы ёй.

Але шанец выратаваць Дашу і падарыць ёй жыццё без болю ёсць! Атрымана запрашэнне на лячэнне ў нямецкай клініцы на 13 красавіка гэтага года коштам 20 000 еўра. На сёння з дабрачыннай дапамогай Наталлі Журбіной ўдалося аплаціць лячэнне, але…

Даставіць Дарку ў Германію можа толькі спецрэйс — беларускія дактары, агледзеўшы Дарку, забаранілі перавозіць дзяўчыну на машыне. Кошт пералёту Дашы разам з маці падназіраннем лекара складае ў абодва бакі 35600 еўра. З дабрачыннай дапамогай Дарчына мама сабрала ўсяго 10 тысяч еўра. Засталося менш за месяц, каб назбіраць яшчэ 25600 еўра!

Наталля Журбіна не ў стане адна выратаваць дачку. Дапамагчы Дарцы можна, пералічыўшы сродкі на дабрачынны рахунак.

Рахунак у цэнтры банкаўскіх паслуг 303

г.Гомель, вул.Жукава, 40а; УНП 400207877; МФО 151501661:

Беларускія рублі: №000000005

(Транзітны рахунак для пераводу сродкаў юрыдычнымі асобамі №3819382100255)

Даляры ЗША: №8400000000057

(Транзітны рахунак для пераводу сродкаў юрыдычнымі асобамі №3819382102367)

Расійскія рублі: №6430000000006

(Транзітны рахунак для пераводу сродкаў юрыдычнымі асобамі №3819382102367)

Еўра: №9780000000006

(Транзітны рахунак для пераводу сродкаў юрыдычнымі асобамі №3819382102367)

Дабрачынны рахунак для пераводаў у беларускіх рублях:

ГФ па Гомельскай вобласці «Белінвестбанк»

УНП 400078280

3134123500025 код 768



Уладальнік рахункаў Журбіна Наталля Артураўна

Для электронных пераказаў:

Easypay 01157140

З Беларусі папоўніць дадзены кашалёк можна ў любым паштовым аддзяленні або ў аддзяленнях банкаў

Кашалькі webmoney:

Беларускія B205359430572

Еўра E223711763318

Расійскія R329802128937

Даляры Z145964412101

Тэлефон Дашынай мамы +375447302375 (Наталля)

Больш падрабязна на сайце dashahelp.ru

# Газетка дзеткам



1. Жывёла, якая бывае і свойскай, і дзікай.
2. Вы самі можаце збудаваць з галля.
3. Ён плавае на караблях.
4. Задняя частка шыі.
5. Ён хоча і даб'ецца свайго.
6. Ён куе жалеза.
7. Яго прадаюць.
8. Здараецца, калі з агнём неасцярожныя.

**Валянціна Карнялюк**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | А | | А | |
| | | А | | А | |
| | | А | | А | |
| | | А | | А | |
| | | А | | А | |
| | | А | | А | |
| | | А | | А | |
| | | А | | А | |

Адказы на старонцы 16.




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Беларускі баец Віталь Гуркоў стаў пераможцам турніру кікбаксёраў K-1 World Max 2010 East Europe, якія адбыўся 19 сакавіка ў Мінску. Гэта дало яму права выступіць у сусветным фінале K-1 Max. Гуркоў — адзін з нешматлікіх спартоўцаў, якія аддаюць перавагу беларускай мове. Інтэрв'ю БТ ён даваў па-беларуску, а сваю перамогу прысвяціў сябрам, а таксама «сваёй краіне і ўсім, хто лічыць сябе беларусам і ганарыцца сваім народам».**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Паводка-2010: пад пагрозай затаплення — 80 паселішчаў. Падрабязней пра гэта чытайце на старонцы 6.**




**Нафта ў абмен на бульбу.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Вясновая Playboy Party ў адным з мінскіх клубаў.**

## АНЕКДОТЫ

* * *

— Калі надумаюся ажаніцца, вазьму за жонку прыгожую, верную, разумную, гаспадарлівую...

— Ты што — мусульманін, каб адразу чатырох браць?

* * *

Я лічу, што на выбарах свабода выбару ёсць у кожнага, хто лічыць.

* * *

Астраномы выявілі на Месяцы савецкі «Месяцаход-2». У месяцахода былі скручаныя колы і выдзертая магнітола.

* * *

Калі вы збіраецеся назаўжды кінуць курыць, найлепей рабіць гэта на складзе выбухоўкі.

* * *

Зірнуў у каляндар. Канец свету 21 студзеня 2012 года прыпадае на пятніцу! Выходзіць, адпрацуем увесь тыдзень, а пасля канец! А як жа выходныя?

## ГУМАР

* * *

Спярша было Слова, потым — слова за слова...

**(З падслуханага)**

* * *

— Вось бы не працаваць і каб было шмат грошай...

— Ёсць адна магчымасць... Толькі цябе будуць біць нагамі...Згода?

— Так... Але шмат грошай, нічога не рабіць... Згода.

— Тады ты можаш быць сапсаваным банкаматам!

**(Падслухана ў офісе)**

* * *

Пра Эдзіту П'еху ніколі не пачуеш, каб яна напілася, звалілася ў аркестравую яму, нахаміла камусьці. Цудоўна, што засталіся такія людзі.

**(Падгледжана на сайце Эдзіты П'ехі)**

* * *

Сплаў па рацэ ў гумовай лодцы — файная рэч. Да прыкладу, у каменнай сплаўляцца значна цяжэй.

**(Падцікавана ў перадачы «Экстрэмальнае выжыванне», канал National Geographic)**

* * *

Ён (грымотным голасам): Ці ты знаеш, хто ты?

Яна (плаксіва): Не знаю і знаць, о божа, не хачу!

Ён (яшчэ больш грымотна): Ты — дурніца і прастытутка!

Яна: А-а-а, каб ты здох! Каб цябе...

Ён: А ці ты знаеш, хто я?

Яна: А-а, каб ты здох! Не ведаю і ведаць не хачу...

Ён (урачыста): Я — адказны кватэраздымшчык!

**(Падслухана за сценкай)**

**ПК**

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Цімкавічы Слуцкага павета.** Немаведама хто падрэзаў слупы тэлефонныя каля нашага мястэчка, а каля вёскі Лешня спаліў цагельню з аўсом памешчыка. Тэлефон прыналежаў князю Радзівілу.

**«НН». №12. 1910.**

Колісь 25 сакавіка ўспрымалася найперш як антысавецкае або эміграцкае ці архіўнае свята. Сёння нічога гэтага ўжо няма. 25 сакавіка за гэты час набыло сваю НАШУ гісторыю і сваю НАШУ назву — Дзень Волі.

**«НН». №12. 2000.**

**Адказы да старонкі 15.**

Кабан, шалаш, марак, карак, змагар, кавэль, тавар, пажар.

Наша Ніва

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6330.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 23.03.2010.

Замова № 1405.

Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.

Цана дамоўная.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614